Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 83 (5757) | 10 красавіка 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Калі нашы партыйныя таварышы, захапляючыся гаспадарчымі поспехамі, адыходзілі ад палітыкі, гэта была крайнасць, каштаваўшая нам вялікіх афяр. Калі цяпер некаторыя нашы таварышы, беручыся за ўмацаванне партыйна-палітычнай работы, уздумаюць адыйсці ад гаспадаркі, то гэта будзе другая крайнасць, якая будзе нам каштаваць не меншых афяр. Нельга шарахацца ад адной крайнасці да другой. Нельга аддзяляць палітыку ад гаспадаркі. Мы не можам адыйсці ад гаспадаркі таксама, як не можам адыйсці ад палітыкі".

(З заключнага слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б) 5 сакавіка 1937 года)

ВЫБАРАМІ ПАРТОРГАНАЎ ТРЭБА КІРАВАЦЬ

Рашэнні Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі, даклад і заключнае слова таварыша Сталіна ўсебакова акрэслілі задачы і напрамак карэннай перабудовы партыйнай работы.

З увядзеннем Сталінскай Канстытуцыі да канца разгортваецца совецкі дэмакратызм, распыраецца база дыктатуры рабочага класа, а значыцца, павышаюцца і ўскладняюцца задачы кіраўніцтва. Чым шырэй і складаней задачы, чым большыя масы ўцягваюцца ў актыўнае палітычнае жыццё, тым настойлівей неабходнасць у павышэнні ролі партыі як правадыра і арганізатара працоўных. Сутнасць новых задач партыі састаіць перш за ўсё ў тым, каб павысіць актыўнасць, пільнасць, адказнасць кожнага комуніста за лёс рэволюцыі, каб «павярнуць увагу нашых партыйных таварышоў, якія ўгрузаюць у «бягучых пытаннях» па лініі таго або іншага ведамства, — у бок вялікіх палітычных пытанняў міжнароднага і ўнутранога характару». (Сталін).

Пленум ЦК ВКП(б) у якасці адной з рашаючых задач перабудовы партыйнай работы прапанаваў правесці выбары партыйных органаў на падставе безумоўнага ажыццяўлення ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Гэта мерапрыемства мае велізарнае палітычнае значэнне!

На ўсёй краіне ўжо абмяркоўваюцца выбары парторганаў первічных арганізацый. Пачынаюцца выбары раённых камітэтаў. За рэдкім выключэннем, усюды адчуваецца незвычайная актыўнасць радавых комуністаў, якія з усёй рашучасцю, не гледзячы на супраціўленне асобных бюракратаў, па-большэвіцку ўскрываюць недахопы, здзіўляцца тым каштоўнейшым вопытам будаўніцтва, які накапліваюць масы з дня ў дзень.

Партыя жыве яркім і поўнакроўным жыццём. Выбары паказваюць выключнае значэнне рашэнняў Пленума ЦК аб закрытым (тайным) галасаванні кандыдатаў у партыйныя органы. Высоўваюцца тысячы новых людзей, людзей скромных і дзелавых, палітычна стойкіх і адданых рэволюцыі, шматлікімі ніцямі звязаных з масамі. Расце пільны кантроль знізу, развіваецца самакрытыка, а гэта, несумненна, павышае палітычны ўзровень комуністаў, развівае ў іх пачуццё большай адказнасці.

Выбары ў самым разгары. Уся партыя прыведзена ў рух. Ідуць шматлюдныя партыйныя сходы, правяраецца здольнасць кожнага работніка, узровень работы кожнай партарганізацыі. Заклаваюцца асновы будучых поспехаў. У гэтыя дні асабліва вялікая роля і адказнасць партыйнага кіраўніцтва.

На жаль, не ўсе зразумелі, што выбарамі трэба кіраваць, што нельга ў гэтай адказнай справе спадзявацца на самацёк. Іншыя партыйныя работнікі лічаць, што кіраваць — гэта значыць сядзець ля руля і спакойна чакаць, пакуль людзі не наробяць памылак, пакуль якая-небудзь «нечаканасць» не ўдарыць па галаве. Так паступаюць, напрыклад, у Сталінградзе. Там аддзел кіруючых парторганаў абкома разаслаў няправільнае, блытанае, шкоднае пісьмо аб выбарах. Пісьмо гэта некаторы час гуляла па арганізацыі, і несумненна, унесла нямала блытаніны ў правядзенне выбараў. А абком партыі спакойна глядзеў на ўсё гэта і не бачыў нават таго, што робіць яго важнейшы аддзел, да тае пары, пакуль яму на гэта не ўказалі. Хіба гэта нармальна, хіба гэта кіраўніцтва?

Навошта спатрэбілася Сталінградскаму абкому нейкая недарэчная, шкодная інструкцыя ўласнай творчасці? Хіба не ўсё ясна? Хіба рашэнне Пленума і пісьмо ЦК ВКП(б) аб арганізацыі выбараў парторганаў не вызначылі з вычарпальнай паўнатой і ясністю задач выбараў і тэхнікі іх правядзення?!

Правільнае кіраўніцтва павінна паўсямесна забяспечыць цвёрдае і няўхільнае выкананне ўсіх указанняў Пленума Цэнтральнага Камітэта аб перабудове партработы, усіх дырэктыў ЦК аб парадку выбараў. Аднак кіраваць выбарамі — зусім не значыць адміністраваць, ушчамляць, так або інакш, права первічных арганізацый. Ні на мінуту нельга забываць, што задача зараз заключаецца ў тым, каб да канца разгарнуць унутрыпартыйную дэмакратыю, узняць актыўнасць і адказнасць мас, разам з сотнямі, тысячамі комуністаў падмеціць недахопы ў нашай рабоце, ускрыць памылкі, выбраць лепшых большэвікоў у партыйны апарат.

Але ці значыць гэта, што трэба зусім адмовіцца ад кіраўніцтва, самаўхіліцца ад выбараў? Думаць так могуць толькі людзі, якія не разумеюць прынцыпаў пабудовы нашай партыі, прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма. Не лішне напомніць, што дэмакратычны цэнтралізм азначае выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі зверху данізу і адначасова — безумоўную абавязковасць рашэнняў вышэйшых органаў для ніжэйшых і для ўсіх членаў партыі. Разгортванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі зусім не выключае, як гэта думаюць наіўныя людзі, а дапускае больш дасканалыя формы кіраўніцтва вышэйстаячымі арганізацыі ніжэйстаячымі.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што многія райкомы самаўхіліліся ад выбараў, сядзяць склаўшы рукі, выступаюць у ролі пабочных наглядальнікаў, а не партыйных органаў, закліканых уважліва сачыць за ходам выбараў і своечасова выпраўляць памылкі. Ніхто-ж не здымаў адказнасці за кіраўніцтва выбарамі, ніхто не пазбаўляў райкомы іх права і абавязку выпраўляць памылкі, а калі ў наяўнасці парушэнне дырэктыў ЦК або статута партыі, то і адмяняць выбары.

Горш за ўсё тое, калі шкоднае самаўхіленне ад кіраўніцтва выбарамі заахвочваецца вышэйстаячымі партыйнымі інстанцыямі. Здзіўленне выклікаюць, напрыклад, рашэнні курскага абкома і ўпаўнаважанага Камісіі Партыйнага Кантроля па Курскай вобласці тав. Чубіна. У тым, што ў час абмеркавання кандыдатур на сходзе скуранога завода прысутнічаў інструктар райкома, абком і ўпаўнаважаны Камісіі Партыйнага Кантроля ўглядаюць парушэнне дырэктыў ЦК. Чаму? У чым тут парушэнне? З якога гэта часу прадстаўнік райкома не можа прысутнічаць пры абмеркаванні кандыдатур і галасаванні? Зусім відавочна, што, папраўляючы такім чынам райком, у Курску няправільна арыентуюць арганізацыю.

Падобнага роду памылак, падобнага роду няправільных дырэктыў, на жаль, нямала. Яны гавораць аб тым, што людзі забываюць статут нашай партыі, асновы дэмакратычнага цэнтралізма, людзі працуюць адхіліцца ад кіраўніцтва выбарамі. Нічога, апрача шкоды партыі, падобная практыка прынесці не можа.

Факты парушэння ўказанняў ЦК аб арганізацыі выбараў (выбары шчотнай камісіі да абмеркавання кандыдатур у партком, прысутнасць пабочных людзей у памяшканні шчотнай камісіі), выпадкі заціску самакрытыкі, факты, праўда, адзінкавыя, калі ў партыйныя органы здолелі пралезці чужыя партыі людзі, — усё гэта гаворыць аб неабходнасці ўзмацнення кіраўніцтва выбарамі, аб павышэнні пільнасці ўсіх партыйных арганізацый. Неабходна рашуча спыняць якія-б там ні было парушэнні ўказанняў ЦК партыі аб выбарах, неабходна паўсямесна забяспечыць тайнае (закрытае) галасаванне кандыдатур, бязлітасна ўскрываць і выкрываць малейшыя спробы пазбавіць законных правоў членаў партыі, спробы заціску самакрытыкі, спробы звесці выбары да простай фармальнасці.

Там-сям ужо прабуюць згарнуць самакрытыку або задавальваюцца крытыкай неканкрэтнай, нядзелавай. Неабходна яшчэ раз напомніць, што лозунг самакрытыкі — не часовы лозунг. Самакрытыка — гэта метад соцыялістычнага будаўніцтва, верная зброя партыі супроць ворагаў і бюракратаў. Самакрытыка — гэта вялікая сіла, якая рушыць партыю наперад.

Вядома, самакрытыка закране і ўжо закранае многа людзей, прычым і людзей, адданых партыі, якія маюць вялікія заслугі перад рэволюцыяй, але зараз працуюць дрэнна. Ну і што-ж? За добрае мінулае дзякуй, а за тое, што той ці іншы таварыш спачыў на лаўрах, страціў рэволюцыйную страсць у рабоце, аброс, акружыў сябе нягодными работнікамі, — за ўсё гэта трэба рашуча крытыкаваць.

Толькі дзейсная, большэвіцкая самакрытыка самакрытыка не гледзячы на асобы можа расчысціць шлях, развязаць сілы і здольнасці кожнай партарганізацыі, кожнага комуніста і забяспечыць паспяховае выкананне рашэнняў Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

(Перадавы артыкул «Праўды» ад 9 красавіка).

АБСТРАКТНАЯ КРЫТЫКА

Учора пачаўся справаздачна-выбарчы сход самай буйнай у Гомелі партарганізацыі завода імя Ланцуцкага.

На працягу паўтары гадзіны т. Кузняцоў чытаў свой даклад, аперыруючы наборам цытат і зазубранымі фармуліроўкамі, і там-сям успамінаючы прозвішчы людзей і другарадныя факты з работы сваёй партарганізацыі.

Сярод удзельнікаў схода стварылася ўражанне, што гэта не справаздача парткома, а захудалая лекцыя на няпэўную тэму.

Тав. Кузняцоў па сутнасці нічога не сказаў аб рабоце партарганізацыі завода імя Ланцуцкага. Між тым, у партарганізацыі квітнее сямейственасць і кругавая парука, заціск самакрытыкі, што дало магчымасць шкоднікам тварыць свае брудныя справы на заводзе. Ні адным словам т. Кузняцоў не закрануў паліталдзел чыгункі і гарком партыі, не крытыкаваў работу членаў парткома, начальніка завода, старшыню заўкома.

Шкодніцтва і сабатаж стаханаўскага руху т. Кузняцоў называў слабой работай завода і партарганізацыі.

Увогуле даклад атрымаўся такім, што ён нікога і нічога канкрэтнага не закрануў. Гэты, з дазволу сказаць, даклад акрэсліў далейшы ход работы схода. У спрэчках па дакладу запісалася 2—3 чалавекі. А потым кожнага новага прамоўцу старшыня схода ледзь не сілком выцягваў на трыбуну. За рэдкім выключэннем гэтыя выступленні насілі такі-ж абстрактны характар, як і даклад. Адчуваецца, што выступаючыя гавораць нібы па прымусу і чагосьці не дагаварваюць.

Сход з самага пачатку стаў на няправільны шлях. Актыўнасці ўдзельнікаў схода не было. Гомельскаму гаркому партыі і паліталдзелу чыгункі трэба выправіць памылку, дапушчаную партсходам завода імя Ланцуцкага.

П. Ч.

РАЗГАРНУЦЬ СЯЎБУ ЗЕРНАВЫХ І КАНЮШЫНЫ ВА ЎСІХ РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

Сыезд у поле жаночай трактарнай брыгады Дзержынскай МТС.

Фото Рытава (БСФ).

НЕ ДАПУСКАЦЬ ПРАСТОЯЎ ТРАКТАРОЎ

Не прыходзіцца даказваць, якую велізарнейшую адказнасць нясуць машынатрактарныя станцыі за правядзенне веснавой пасеўнай кампаніі, за павышэнне ўраджайнасці. Трактарны парк, узбагаціўшыся ў гэту вясну новымі тысячамі машын, можа і павінен паказаць у гэтым годзе новыя ўзоры сваёй работы ў барацьбе за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Аднак, з першых дзён работы ў полі многія машынатрактарныя станцыі паказалі сябе дрэннымі арганізатарамі пасеўнай. З месц паступае шмат сігналаў аб тым, што ў радзе МТС трактары прастойваюць галінамі і нават цэлымі днямі.

Напрыклад, трактары Камарынскай МТС прастойваюць на полі па некалькі дзён толькі таму, што ім правезен неабраякасны рамонт. У новаарганізаванай Добрамысленскай МТС да гэтага часу не атрыман бак для гаручага. Трактары выйшлі ў поле, а забяспечанасць гаручым усяго на два дні. Не забяспечыла сябе гаручым і Дзержынская МТС.

Ёсць і такія машынатрактарныя станцыі, якія да гэтага часу яшчэ не закончылі рамонту свайго трактарнага парка. З той-жа Дзержынскай МТС адна толькі брыгада выйшла на ўчастак, астатнія-ж брыгады не прыступілі да работы толькі таму, што іх трактары чакаюць рамонту. Дзевяць трактароў не адрамантаваны ў Полацкай МТС, чакаюць рамонту два трактары Бешанковіцкай МТС. Астатнія трактары гэтай МТС не адпраўлены яшчэ на вытворчыя ўчасткі.

Падобныя факты наглядаюцца ў Хойніцкай, Ельскай, Бачэйкаўскай, Кучынскай, Асвейскай, Расонскай і іншых машынатрактарных станцыях.

Трэба прама сказаць, што ні дырэктары МТС, ні Наркамзем не арганізавалі як след своечасовы рамонт трактарнага парка. Зімовы перыяд не быў выкарыстан для правядзення рамонту. Дырэктары многіх машынатрактарных станцый пусцілі гэту важную справу на самацёк, а Наркамзем стаяў у баку ў ролі пасіўнага наглядальніка.

З рук вон дрэнна была праведзена прыёмка адрамантаваных трактароў. У гэтай справе дырэктары МТС і Наркамзем праявілі выключную несур'ёзнасць. Прыёмка ў большасці сваёй праводзілася фармальна.

Усё гэта прывяло да таго, што зараз у радзе машынатрактарных станцый у часе палявых работ трактары астанавіліся. Горш за ўсё, што і зараз яшчэ няма належнай трывогі за работу трактарнага парка.

Неадкладна трэба прыняць усе меры да таго, каб забяспечыць нармальную работу трактароў. Кожны трактар павінен працаваць без малейшай затрымкі. Трэба неадкладна паслаць у трактарныя брыгады механікаў для ліквідацыі ўсякіх перашкод і непаладак у рабоце трактароў. Наркамзем павінен неадкладна паслаць у дапамогу МТС усіх сваіх спецыялістаў трактарнай справы, забяспечыць усе трактарныя брыгады гаручым.

Нельга ў такі адказнейшы перыяд правядзення веснавой пасеўнай кампаніі ўпускаць ніводнай мінуты. Трэба зразумець, што малейшы нават прастой хаця-б аднаго трактара з'яўляецца вялікім тормазам у правядзенні веснавой пасеўнай кампаніі.

С. С.

У ХОЙНІКАХ ЧАКАЮЦЬ ПАЦЯПЛЕННЯ

У гэту вясну калгас «Пролетарый» Тралічаўскага сельсовета павінен пасеяць 500 гектараў ранніх яравых культур. Глеба добра прасохла, стаяць цёплыя сонечныя дні. Ёсць усе ўмовы для разгортвання сяўбы. Тут два трактары Хойніцкай МТС, 220 рабочых коней, хапае рабочых рук. Між тым разгарнуць сяўбу не спяшаюцца. Старшыня калгаса Жаляк разважае, што з сяўбой можна пачакаць. Падрыхтоўка глебы праходзіць марудна, трактары і коні прапускаюць без поўнай нагрузкі, зрываецца сяўба канюшыны і баранаванне азімых.

Суседнія калгасы гэтага сельсовета таксама не разгарнулі палявых работ. Старшыня калгаса «Хваля рэволюцыі» Немчанка рознымі сродкамі імкнецца адцягнуць пачатак палявых работ. Ён таксама спасылаецца на тое, што мокра, талы як глеба прасохла больш чым патрэбна. 2 трактары прастайваюць без работы.

І гэта такое становішча ў перадавым Стрэльчанскім сельсавеце, як яго лічаць у раёне. Старшыня сельсовета Снігір самазадаволена сядзіць у канцылярыі, яго намеснік Смольскі арыентуе калгасы на позюю сяўбу, на расцягнутыя тэрміны. Калгасы сельсовета яшчэ поўнасцю не вывезлі гною і торфу.

Што-ж можна гаварыць аб астатніх сельсоветах? Да апошняга часу толькі асобныя калгасы больш-менш разгарнулі палявыя работы і так-сяк праводзяць сяўбу. Усюды разважанні аб лепшым надвор'і і папаўненні. Знаходзячыся ў палоне гэтых шкодных разважанняў, старшыні Бабчынскага, Паташанскага, Барысаўшчанскага, Паселіцкага і інш. сельсоветаў веснавую сяўбу адкладваюць на другую палову красавіка.

У радзе калгасаў у першыя дні дапускаюцца грубыя парушэнні самых элементарных правіл агратэхнікі. Як правіла, зяблева не барануецца. На палях калгаса «Хваля рэволюцыі» трактары праводзяць ворыва па непрабаранаванаму зяблеву. Усё поле ў агрэхах. У калгасе «Іскры Ільіча» пачалі раскідваць гной таксама па непрабаранаванаму зяблеву. Асабліва наглядаецца дрэнная якасць палявых работ у калгасах, якія абслугоўваюцца МТС. Трактарысты праводзяць ворыва зусім мелка.

Ёсць многа выпадкаў, калі сеюць непратручаным насеннем. Калгасы Дольгавіцкага сельсовета пасеялі непратручаным насеннем 50 проц. зернавых, зусім не пратручваюць насення калгасы Кабылянскага, Араліцкага і іншых сельсоветаў. 9 калгасаў у раёне зусім не забяспечылі сябе матарыяламі для пратручвання насення. Акты аб пратручванні ні ў адным калгасе не падпісаны аграномамі. Дарэчы, аграномы ў першыя дні не прыняліся за арганізацыю высокаякаснага правядзення сяўбы. У калгасе «11 Кастрычнік», куды аграномы ніколі не заязджаюць, сеялку ўстанаўліваюць а паніжаным высевам. Брыгадзір сёмай брыгады Дулан устанавіў высеў замест 1.8 цэнтнера 1.25 цэнтнера на гектар, астатняе насенне забраў сабе. У калгасе «Чырвоная паляна» трактарная сеялка стаіць без работы, а сеюць уручную.

Такое становішча і ў іншых калгасах. Замест арганізацыі пратручвання і радковай сяўбы аграномы гастралююць па калгасах. Старшы аграном райземаддзела Бабылюк у адзін дзень аб'ехаў 10 калгасаў. Ясна, што такая работа нічога не дае.

Велізарны трактарны парк працуе без поўнай нагрузкі і большую частку прастойвае. Дырэктар МТС Катляроў і яго намеснік па палітчасці Літвінкоў не кіруюць трактарнымі брыгадамі. Адсяджваецца ў сябе ў канцылярыі і загатчык райземаддзела т. Завапкі. Райземаддзел і МТС па сутнасці самаўхіліліся ад кіраўніцтва сяўбой.

Раённыя арганізацыі і ў першую чаргу РК КП(б)Б і РВК не толькі не ўлічылі ўрокаў поўдня, а спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны і чакаюць яшчэ большага пацяплення. Сакратар райкома тав. Мар'янаў, загатчык сельгасаддзела РК Розін і старшыня РВК Марчанка аператыўнае кіраўніцтва сяўбой падмянілі шматлікімі нарадамі, якія заканчваюцца гарачымі прамовамі і запэўненнямі.

А. ЛОСЬ.

Не вывезлі яшчэ гной і торф

Перадавыя калгасы Дзержынскага раёна распачалі ўжо палявыя работы. Калгас «Чырвоны партызан» узараў пад лён 6 гектараў, засеяў 16 гектараў канюшыны па жыту. Таксама пачалі палявыя работы калгасы: «Прыязў Леніна», «Чырвоная ніва» і «Комунізм». Першыя дні палявых работ паказалі, што гэтыя калгасы да сяўбы падрыхтаваліся добра.

Але гэтага нельга сказаць пра ўсе калгасы, якіх у раёне налічваецца 120. У большасці калгасаў план вывазкі гною і торфу на поле выкананы толькі напалову. У частцы калгасаў Негаральскага і Фанідальскага сельскіх саветаў нехапае насення вікі, сераделы і гароху, а ў калгасах Паланевіцкага і Кучынскага сельскіх саветаў нехапае насення канюшыны. (БЕЛТА).

НОРМА НА ВОРЫВЕ ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА

Большасць калгасаў Веткаўскага раёна пачала палявыя работы. Калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоная моладзь» Бясядскага сельсовета Зянькоў, Кавалёў, Усачоў, Дадычын і Халадзідзін у першы дзень пры норме 0,5 гектара ўзаралі па 0,98 гектара.

Шэсць брыгад калгаса «Партызан» Сівенскага сельсовета на палявыя работы выехалі 27 сакавіка. Зараз ідзе заворванне гною пад пшаніцу. У парадку соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай калгас «Гарадок» узараў 45 гектараў пад яравыя. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя Максіма Горкага Р.-Спонніцкага сельсовета пачалі баранаванне зяблева.

30 сакавіка ў калгасы выехала 14 трактарных брыгад. У складзе іх жаночая брыгада і комсамольская. У кожнай брыгадзе вылучаны чытальнікі газет і літаратуры, а таксама палітагітатары.

ГАРЦУЕЎ.

НА СХОДАХ АКТЫВА НАРКАМАТАЎ

ПАДХАЛІМСТВА ЗАМЕСТ КРЫТЫКІ

8 красавіка ў клубе імя Сталіна пачаўся сход актыва Наркамата харчовай прамысловасці БССР. Сход праходзіць выключна неарганізавана і неактыўна. З 282 чалавек, якія павінны былі прысутнічаць, у першы вечар з'явілася толькі 173 чал. Сход пачаўся са спазненнем на паўтары гадзіны. У другі дзень актыў пачаў работу таксама са спазненнем на пятую гадзіну, прычым з'явілася ўсяго 112 чалавек. Не палічылі патрэбным прыбыць на актыў нават кіраўнікі такіх буйнейшых прадпрыемстваў, як гомельскі тлушчакамбінат (тав. Кейзер), Белгазяржспірт (тав. Кузмічоў) і інш. Зусім мала на актыве стаханаўцаў.

Дакладчык нарком харчовай прамысловасці тав. Крылоў толькі заклікаў актыў выступіць з крытыкай работы наркамата, а сам палічыў за лепшае абыйсці гэту «непрыемную» справу. Дакладчык не мабілізаваў гаспадарнікаў на ліквідацыю рэзультатаў шкодніцтва, не намеціў канкрэтных шляхоў для перабудовы работы наркамата, трастаў і прадпрыемстваў у адпаведнасці з рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна. У выніку другая частка даклада атрымалася дзяляцкай, сухой і несамакрытычнай.

На жаль, спрэчкі, якія разгарнуліся на другі дзень, 9 красавіка, не ўзняліся вышэй узроўню даклада і праходзяць вельмі вяла. Крытыка работы наркамата і наркома тав. Крылова ў радзе выступленняў робіцца асцярожна, нерашуча, з агаворкамі, накшталт:

— Нядобра так, Нікалай Петровіч.

— Не ў крыўду будзь сказана... і т. д.

З выключна падхалімскай прамовай па адрасу наркамата выступіў начальнік планавага аддзела менскай фабрыкі «Комунарка» тав. Шастапалаў.

— Апарат наркамата, — заявіў Шастапалаў, — няма за што крытыкаваць, бо ён яшчэ зусім малады. Наадварот, апарат трэба хваліць за тое, што ён захаваў свае старыя кадры.

Даволі дзіўна, як-жа гэта «зусім малады апарат» захаваў «свае старыя кадры»? Аказваецца, «малады апарат» быў створан на базе старога апарата былога ўпаўнаважанага Наркамхарчпрома СССР, пяперашняга наркома тав. Крылова і, бачыце, прамоўца лічыць вялікай заслугай наркамата, што ён захаваў старыя кадры. Няважна, што ў гэтым «маладым апараце» расцвітае бюракратызм і падхалімства, што «старыя кадры» да таго зараслі цінай і адарваліся ад мас, што не маглі нават даць даведку свайму наркому, колькі стаханаўцаў налічваецца ў харчовай прамысловасці. Для тав. Шастапалава ўсё гэта дробязь. У прыпадку падхалімства ён гатоў днём і ноччу расхвальваць апарат наркамата.

Безмястоўным і апалітычным было выступленне дырэктара віцебскага плодавінзавода тав. Каранеўскага. Ён толькі дарэмна адняў у актыва каля поўгадзіны.

Калі спрэчкі і далей будуць ісці на такім-жа ўзроўні, сход не апраўдае сваёй мэты.

С. ГАЛКІН.

ШЧЫРАЕ ПАКАЯННЕ

Учора ў актавай зале БДУ адкрыўся сход актыва Наркамфіна. Даклад аб выніках Пленума ЦК ВКП(б) зрабіў нарком фінансаў БССР т. Кузелька.

На розных прыкладах з практыкі работы наркамата, асобных яго кіраўніцтваў і сектараў, дакладчык паказвае іх буйнейшыя парокі. Сюды адносіцца вузкае лаяльцтва, адсутнасць большэвіцкай праверкі людзей, слабая работа над палітычным выхаваннем кадраў, прыцягненне большэвіцкай пільнасці.

Тав. Кузелька завастрыў увагу актыва на ўроках лепельскай справы, калі аб усіх абураючых фактах грубейшага парушэння рэволюцыйнай законнасці, якія былі ў Лепельскім раёне, наркамат даведаўся апошнім і не ўскрыў своечасова гэты контрэволюцыйны гнойнік. Такія-ж перагібы мелі месца і ў радзе іншых раёнаў Слуцкай і Полацкай округ, Рэчыцы, Жлобіна і інш.

Апарат наркамата быў засмечан чужымі элементамі, ворагамі народу. За 1936 і часткова 1937 гады выключана з партыі 13 загатчыкаў райфа. Некаторыя начальнікі кіраўніцтваў (Спарыхін, Гамак Стальмашок і інш.) выкрыты як былыя балахоўцы, махноўцы, трацкісты-контрэволюцыянеры.

У аддзелах наркамата па два-тры месяцы ляжаць сотні неразабраных скарг. Рэвізіі праводзяцца па-чыноўніцку, людзі не робяць ніякіх палітычных вываадаў таму пасля іх ускрываюць такія буйнейшыя перагібы.

Трэба адзначыць, што тав. Кузелька, заняўшыся шчырым пакаяннем аб сваіх памылках, зусім лёгка закрануў нікудышнюю работу загатчыкаў значнай часткі райфа і акрфа. Тых загатчыкаў райфа, якія па сутнасці тварылі антысовецкія справы, ён міласціва заклікаў толькі прызнаць свае «грахі».

Дакладчык выпусціў такое «дробязнае» пытанне, як падхалімства ў сваім апараце, ён не сказаў, што справа аб грубейшым парушэнні рэволюцыйнай законнасці ў Суражскім раёне два з паловай месяцы марынавалася ў папках работнікаў Наркамата.

Удзельнікі актыва павінны рэзкай большэвіцкай крытыкай шмат у чым паправіць дакладчыка, ускрыць буйнейшыя прарывы ў рабоце фінансавага апарата і ў першую чаргу Наркамата.

І. Т.

АРКТЫЧНЫ ПЕРАЛЁТ ЛЕТЧЫКА ФАРЫХА

МЫС ШМІТА, 8 красавіка. (БЕЛТА). Сёння самалёт «Н-120», кіруемы лётчыкам Фарыхам, у 6 гадзін раніцы пакінуў востраў Вранге́ля. Праз паўтары гадзіны ён удала апусціўся на мысе Шміта. Тав Фарых вярнуўся сюды для запраўкі самалёта гаручым і затым возьме курс на захад па ўзбярэжжу Ледавітага акіяна — на Ніжнюю Калыму — бухту Тіксі — мыс Нордвік — мыс Чэлюскін — Дзіксон — востраў Белы—Вайгач—Нар'ян-Мар — Архангельск — Масква.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

НА СХОДЗЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ СІРОЦІНСКАГА РВК

Партарганізацыя райвыканкома з'яўляецца самай буйнай у Сіроцінскім раёне. Праўда, гэта арганізацыя была пабудавана няправільна. У яе склад уваходзілі члены партыі, працуючыя ў рэдакцыі раённай газеты, райсовеце Асоавіяхіма, банку і інш.

У сваім дакладзе сакратар парткома т. Бутрымовіч крытыкаваў асобных членаў партыі за іх недысцыплінаванасць, але вельмі мала гаварыў аб тым, што партыйная арганізацыя райвыканкома ніякай выхаваўчай работы сярод членаў партыі не праводзіла.

Пасля даклада ў спрэчках выступіла былы сакратар парткома тав. Хамякова. Яна ўсімі сіламі імкнулася апраўдаць сваю бяздзейнасць і згладзіць вострыя куты ў рабоце партарганізацыі. Але тых правалаў, якія мелі месца ў рабоце парткома, замазаць не ўдалося як былому сакратару тав. Хамяковай, так і тав. Бутрымовічу.

На працягу двух дзён члены партыі выкрывалі буйнейшыя недахопы ў рабоце парткома і яго сакратара. Крытыка і самакрытыка ў партарганізацыі райвыканкома запіскалася. Замест гэтага існавала падхалімства, самаўсхваленне, хаця хваліць не было чым. Раён увесь час знаходзіўся на чорнай дошцы. У партыйнай арганізацыі райвыканкома знаходзіліся, як кажуць, усе вялікія людзі, раённыя кіраўнікі. І ўсе сігналы радавых членаў партыі аставаліся без усякага рэагавання.

У парткоме добра ведалі, што на чале райвыканкома сядзіць антысавецкі элемент, разлажыўшыйся тып, нейкі Кабыш. Уся работа яго была накіравана на развал калгасаў. Аб гэтым радавыя камуністы, а таксама раённая газета неаднаразова сігналізавалі. І на гэтыя сігналы ні партыйны камітэт райвыканкома, ні райком партыі не лічылі патрэбным адказаць.

На сходзе з выступленняў было відаць, што партыйны камітэт і яго сакратар на працягу паўтара года займаўся толькі тым, каб заклікаць да парадку таго, хто адважыцца выступіць з крытыкай кіраўнікоў райвыканкома і сакратара парткома. Выступаўшыя ў спрэчках комуністы гаварылі, што раён з'яўляецца самым адсталым у рэспубліцы, у выніку адсутнасці партыйна-выхаваўчай работы сярод членаў партыі, калгаснікаў і аднаасобнікаў. У выніку прытуплення большэвіцкай пільнасці, ворагі мелі магчымасць пранікнуць на кіруючыя пасады ў райвыканкоме. Гэтымі ворагамі аказаліся сакратар райвыканкома Юдзіцкі, загалчык райфа Розенталь, старшы аграном Васілеўскі і інш. Уся іх работа была накіравана на падрыў аўтарытэта партыі і совецкай улады.

Аб іх шкодная дзейнасці ведаў не толькі партком РВК, але і райком партыі і асабліва сакратар райкома тав. Румянцаў. Аднак, мер для таго, каб ачысціць апарат райвыканкома ад класава-чуждых і разлажыўшыхся элементаў, прынята не было.

Гэтыя ворагі працягваюць сядзець у райвыканкоме і па сёнешні дзень. Яны свядома зацягнулі давядзенне планаў рамонту інвентара, вясенняй сяўбы да апошніх дзён. І толькі на партыйным сходзе з усёй большэвіцкай настойлівасцю былі ўскрыты прычыны непадрыхтаванасці раёна да веснавой сяўбы. Так, напрыклад, конныя плугі адрамантаваны ўсяго на 75 проц., конныя сеялкі на 87,5 проц. Гною вывезена на калгасныя палі ўсяго толькі 34 проц. і т. д. Аб гэтым ведаюць кіраўнікі райза, але маўчаць.

На партыйным сходзе ў сваіх выступленнях члены партыі гаварылі аб тым, што на пасадзе старшыні калгаса «Маяк соцыялізма», які знаходзіцца ад раённага цэнтра ў двух кілометрах, доўгі час сядзеў былы актыўны эсэр Савіцкі, сын якога выключан з партыі як трацкіст, заяўлы вораг народу.

На сходзе было ўстаноўлена, што варожая дзейнасць асобных работнікаў райвыканкома цесна звязана з некаторымі работнікамі з Наркамзема. У той час як план па ўкамплектаванню стада авец выканан на 81 проц., у раёне пала вялікая колькасць коней, свіней наркамзем прэміраваў загалчыка райземаддзела Шчарбакова і старшага зоатэхніка Гальпа. Загад быў падпісан нам. наркома Залескім. Да рэчы, Галец быў прэміраван пасля таго, як ён уцёк з раёна.

Усяго, чым мог пахваліцца сакратар парткома, дык гэта тым, што ён правёў дзесяць пасяджанняў парткома і дваццаць агульных сходаў. І зразумела, што агульны сход вынес рашэнне, у якім прызнаў работу парткома зусім нездавальняючай. Ніхто з былых членаў парткома не абран парторгам. Абрана парторгам партарганізацыі РВК актыўны член партыі т. Колціна.

А. МАНЬКОЎ.

У калгасах Барысаўскага раёна пачалі вывучэнне даклада таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б). НА ЗДЫМКУ: чытка даклада таварыша Сталіна ў адной з брыгад калгаса «Чырвоная змена» Зембіцкага местсовета Барысаўскага раёна.

Фото Я. Салавейчыка.

НА ЗАЦІСК САМАКРЫТЫКІ НЕ РЭАГАВАЛІ

Менская аўтарамонтная станцыя—маладое прадпрыемства. Яна створана ў апошнія два гады. Тут працуюць 16 комуністаў, якія прышлі з другіх арганізацый горада.

Выступаючыя комуністы на справаздачна-выбарчым партыйным сходзе выявілі абуральныя факты заціску крытыкі. Дырэктар станцыі т. Герасімаў заціскаў крытыку ўсякімі спосабамі, якія толькі яму прыходзілі ў галаву. Калі пачынаеш гаварыць аб агінаснях на станцыі, дырэктар Герасімаў лае рабочых і комуністаў.

Калі была напісана заметка ў насценгазеце аб сямействе́насці ў дырэкцыі, дырэктар Герасімаў усюды крычаў: «Хлусня, няпраўда, падам у суд» і т. д. Калі на парткоме пачалі крытыкаваць Герасімава, ён дэманстрацыйна бразнуў дзвярыма ў пакоі парткома, дзе адбывалася пасяджэнне, і пайшоў, заявіўшы, што заўтра не выйдзе на работу. Комуніст тав. Фіш расказаў на сходзе, што дырэктар Герасімаў, калі яго крытыкуюць, бярэ слова заўсёды ў канцы і грампіць выступаючага словамі: «Дурань, ты ні чорта не разумееш» і інш.

Сталінскі райгарком ведаў аб гэтых агідных фактах заціску крытыкі на станцыі, але не рэагаваў на гэта.

Выступаўшыя комуністы тт. Кантар, Слуцкер, Глускер і Тарасевіч гаварылі ў сваіх выступленнях аб дрэннай рабоце парткома, аб недастатковай сувязі комуністаў з беспартыйнымі рабочымі, аб недахопах партыйна-масавай работы на станцыі. Яны таксама ўказвалі, што 7 членаў партыі не атрымліваюць партыйных заданняў, што партыйныя сходы збіраюцца наспех, не падрыхтоўваюцца.

Тт. Паддубны, Іткін, Конвісэр указвалі на адсутнасць кіраўніцтва партарганізацыяй з боку Сталінскага райкома, таркома і адзедаў ЦК КП(б)Б. Калі і прыязджаў хто-небудзь з райкома або таркома, яны гаварылі толькі з дырэктарам т. Герасімавым, а не з радавымі комуністамі, якія маглі-б многа расказаць пры гутарцы аб стане партыйнай работы і непаладках на станцыі. Комуніст т. Паддубны расказаў: «Я прыехаў у Беларусь і на другі дзень пайшоў з дырэктарам станцыі т. Герасімавым у ЦК КП(б)Б да тав. Готфрыда. Тав. Готфрыд адразу накінуўся на мяне і Герасімава і сказаў: «Вы партачы!». Я падумаў, чаму ён адразу партачом абзывае, адкуль ён бярэ, а Герасімаў мне гаворыць: «Пойдзем, дрэнна працуем». На гэтым была першая і апошняя дапамога тав. Готфрыда.

— Да нас на станцыю,—гаворыць комуніст т. Іткін, — прыехаў з ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд і гаворыць: «У вас справа з работай дрэнная, збярыце комуністаў і прыходзьце ў ЦК, мы там пагаворым з тав. Валковічам». А калі мы сабраліся і прышлі ў ЦК, нам тав. Готфрыд аказаў: «Вельмі занят, няма калі, націскайце».

Пасля ацэнкі работы парткома і прынята разгорнутага рашэння аб яго справаздачы партыйны сход прыступіў да абмеркавання кандыдатур у новы партком. Комуністы ў неабмежаванай колькасці абмяркоўвалі падрабязна з дзелавога боку кожную высунутую сходам кандыдатуру.

Па кожнай кандыдатуры выступала за і супроць ад 10 да 14 чалавек. У новы партыйны камітэт абраны тайным галасаваннем тры чалавекі—тт. Тарасевіч (майстар цэха), Міселевіч (рабочы-каваль, стахановец) і Горшман. Сакратаром парткома абран тайным галасаваннем тав. Тарасевіч.

БЕЛЬСКІ.

БЕСПРЫНЦЫПНЫЯ СКЛОКІ АСЛАБІЛІ БАРАЦЬБУ З ВОРАГАМ

Некалькі дзён таму назад у Магілеўскім педінстытуце адбылася сумная падзея. Студэнт першага курса т. Чубакоў кінуўся з высокага маста і ўтапіўся ў веснавых водах Дняпра. Кіраўнікі інстытута да гэтага факта аднеслися вельмі хладнакроўна. Не выпадкова і сакратар парткома інстытута т. Любецкі на справаздачна-выбарчым сходзе партыйнай арганізацыі ў сваёй справаздачы ўмаўчаў аб гэтым сур'ёзнейшым факце, які сам па сабе абвінавачвае партарганізацыю.

Са справаздачы сакратара і спрэчак высветлілася, што партком па сутнасці не займаўся партыйнай работай, што ён культываваў у партарганізацыі бесклапотнасць, склочніцтва і сямейнасць.

У інстытуце больш тысячы студэнтаў. Але партком ніякай выхаваўчай работы сярод іх не арганізаваў. У ленінскіх кутках нават няма газет. Іменна ў рэзультаце адсутнасці якой-бы ні было выхаваўчай работы, нячулых адносін да жывога чалавека меў месца факт самагубства, расквітае п'янства, бытавое разлажэнне.

Партком пагруз у дробных гаспадарчых справах — размеркаванне стыпендый, выдача пуцёвак, аднаразовых дапамог — і забыўся пра свой асноўны абавязак — праводзіць партыйна-палітычную работу. На глебе гэтага ў самім парткоме стварыліся групы: з аднаго боку, сакратар парткома Любецкі, дырэктар інстытута Казакоў, а з другога боку, астатнія члены парткома. Пачаліся склокі ўнутры парткома, якія перайшлі ў партыйную арганізацыю. Члены парткома Шчэрба і Шынкевіч замест большэвіцкай пастаноўкі пытання аб недахопах работы ў партыйным камітэце, аб сямейнасці Любецкага і Казакова самі нічога не рабілі і як мяшчане крытыкавалі іх па-за вуглямі, стваравучы атмасферу безупынных склок. Гэтым карысталіся ворагі, якія вольна арудвалі ў сценах інстытута. Тут былі трацкісты, нацдэмы, эсэры і інш. Контрреволюцыйная сволач, якая адкрыта, на вачах у партыйнай арганізацыі праводзіла яўна варожую работу. Але партарганізацыя да таго пагрузла ў склоках, што страціла асноўную большэвіцкую якасць—рэволюцыйную пільнасць і не змагалася з ворагам. Гэтаму яшчэ спрыяў заціск самакрытыкі з боку сакратара, парткома Любецкага і дырэктара Казакова.

Аб становішчы партыйнай арганізацыі інстытута райком партыі меў вельмі цярпімае ўяўленне, хоць інстытут знаходзіцца ў яго пад бокам. Сакратар райкома т. Клімчук упершыню прыйшоў сюды толькі на справаздачны сход а культпроп райкома т. Гутман калі і быў, то ў ролі амерыканскага наглядальніка. Характэрны факт. У кастрычніку мінулага года на партыйным сходзе інстытута высветлілася контрреволюцыйная работа выкладчыка Чудовіча. Прысутны на гэтым сходзе т. Гутман замест большэвіцкай арыентацыі партыйнай арганізацыі выступіў у абарону гэтага ворага народу, які праз кароткі час быў выкрыт органамі НКУС.

У інстытуце да гэтага часу яшчэ працягваюць сваю варожую дзейнасць рад нацдэмаў і эсэраў.

Задача партыйнай арганізацыі—смела разгортваючы большэвіцкую крытыку і самакрытыку да канца выявіць і выпаць з адказнага ідэалагічнага фронта ворагаў народу.

Р. ДОДЗІН.

НА НІЗКІМ УЗРОЎНІ

У гэты дзень агульны сход первічнай партыйнай арганізацыі пры горсовеце (Асіпавічы) распачаўся своечасова. З'явіліся ўсе, за выключэннем аднаго члена партыі, які не прысутнічаў па ўважлівых прычынах (хвароба). У пачатку схода прачыталі даклад таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б) «Аб недахопах партыйнай работы і мерах ліквідацыі трацкісцкіх і іншых двурушнікаў».

Пасля чыткі даклада таварыша Сталіна заслухалі справаздачу парторга тав. Мінаева.

Да пытання аб рабоце первічнай партыйнай арганізацыі горсовета, якая павінна стаць на чале і кіраваць падрыхтоўкай да новых выбараў у советы, дакладчык падышоў па-дзяляцку і не змог раскрытыкаваць работу кіраўніцтва горсовета, не ўскрыў усіх абураючых недахопаў. Не гаварылі і таварышы ў спрэчках аб тым, што горсовет не зразумеў сутнасці новага павароту ў жыцці нашай краіны. Горсовет прадаўжае працаваць па старыцы.

Як дакладчык, так і рад таварышоў зусім правільна адзначылі, што райком партыі, і ў прыватнасці інструктар райкома таварыш Лук'яновіч, дрэнна кіруюць і мала дапамагаюць первічнай партыйнай арганізацыі. Прадстаўнікі райкома не бываюць на партыйных сходах.

Амаль усе таварышы выступалі ў спрэчках, некаторыя па два разы, але-ж рад выступаючых замест таго, каб пасапраўднаму разгарнуць крытыку і самакрытыку, расказвалі аб сваёй рабоце ў выглядзе апраўдання.

Ад старшыні горсовета тав. Голанда агульны сход чакаў больш самакрытычнага выступлення, але-ж яго не было. Па яго выступленні атрымалася, што планы ёсць, ёсць спісы секцый, дэпутацкіх груп, лінія ёсць, але вось справа не рухаецца з месца.

Таварышы, якія выступалі на сходзе, гаварылі аб тым, што ў райпартарганізацыі панавала практыка кааптацыі ў кіруючыя партыйныя органы. На адным з раённых партыйных сходаў завочна кааптавалі ў склад райкома, не гледзячы на пратэсты комуністаў, начальніка палітаддзела асіпавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі тав. Хількевіча і намесніка дырэктара МТС па палітчасці тав. Бубліса. Сходам кіраваў тады намеснік сакратара райкома партыі тав. Краско.

Пасля абмеркавання пісьма ЦК ВКП(б) «Аб арганізацыі выбараў парторганаў» намецілі 3 кандыдатуры для выбараў парторга. Кандыдатура таварыша Голанда была адведзена таму, што ён мае партыйнае спагнанне. Пры закрытым (тайным) галасаванні, захоўваючы ўказанне ЦК ВКП(б), большасцю галасоў парторгам абран тав. Мінаеў.

Асіпавічы. М. ГЕРШМАН.

ПАРУШАЮЦЬ ПАРАДАК ВЫБАРАЎ

КІРАВА. Справаздачна-выбарчыя сходы ў кіраўскай райпартарганізацыі праходзяць на надзвычайна нізкім палітычным узроўні.

На справаздачна-выбарчым сходзе Любовіцкай партыйнай арганізацыі было дапушчана прамое парушэнне рашэння ЦК ВКП(б) аб парадку выбараў у партыйныя органы. Так, па ўказанню інструктара РК КП(б)Б тав. Кароткіна выбары парторга ў гэтай партарганізацыі правялі не закрытым тайным галасаваннем, а адкрытым, матывуючы малай колькасцю комуністаў.

Крытыка і самакрытыка праходзіць на нізкім узроўні. Аб гэтым сведчыць праведзены справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі райвыканкома. На сходзе ніхто з членаў партыі не адзначаў таго факту, што пад носам райвыканкома і райкома партыі творыцца шкодніцтва ў будаўніцтве. Сотні тысяч грошай даремна затрачаны на будаўніцтва артэзіянскага калодзца, які закінут зараз, на будаўніцтва лазні, якая «будуецца» ўжо тры гады, на будаўніцтва кіно, гукавая кіноўстаноўка якога прышла ў негоднасць, не будучы ўведзенай у эксплаатацыю. Аб усіх гэтых пытаннях на партыйным сходзе не гаварылі.

Рад комуністаў адсутнічаў на партыйным сходзе. Так, на сходзе гэтай партарганізацыі 4 красавіка адсутнічалі Дамброўскі (загалчык райза), Дабрускін (упоўкамзар) і Касцюк (старшыня райвыканкома). Гэты факт сведчыць аб адсутнасці партыйнай дысцыпліны.

ЯРЧАК.

ПАМЫЛКІ НЕ ВЫПРАЎЛЯЮЦЬ

«Звязда» ўжо пісала аб тым, што ў Мозыры груба парушаюцца ўказанні ЦК ВКП(б) аб правядзенні справаздачна-выбарчых сходаў. Мозырскі акругком партыі адмяніў справаздачна-выбарчы сход у первічнай партарганізацыі фабрыкі «Профінтэрн», які быў праведзен з парушэннем указанняў ЦК.

Не гледзячы на гэта, ўказанне ЦК ВКП(б) аб парадку правядзення выбараў у мозырскай арганізацыі працягвае парушацца. Так, у первічнай арганізацыі мозырскага горсовета старшынёй шчотнай камісіі быў абран прадстаўнік райкома Гольдшварц, які не з'яўляецца членам гэтай арганізацыі. У партарганізацыі гандлёва-загатоўчых устаноў г. Калінкавічы ў шчотную камісію быў абран прадстаўнік райкома Шульман, які з'яўляецца членам другой арганізацыі.

ФРАЛОЎ.

У партыйных арганізацыях

РЭЧЫЦА. Справаздачна-выбарчыя сходы праведзены ў 8 партарганізацыях. З 89 членаў і кандыдатаў партыі прысутнічала на сходах 84 чал. У спрэчках выступіла 80 чалавек.

НАРОЎЛЯ. Справаздачна-выбарчыя сходы праведзены ў пярвічных арганізацыях — райаддзеле НКУС, МТС, райсаюзе. З 22 прысутных выступалі ў спрэчках 24 чалавекі. Комуністы ўказвалі, што сакратар РК аддараўся ад партыйных мас, рэдка бывае на сходах пярвічных партарганізацый.

ХОЙНІКІ. Справаздачна-выбарчы сход у Стралічаўскай партарганізацыі пачаўся са спазненнем на адну гадзіну з-за спазнення аднаго кандыдата партыі. Другія сходы пачыналіся своечасова. Выступаючыя ўказвалі на дрэнную падрыхтоўку партсходаў, адсутнасць палітыка-масавай работы. У партарганізацыі РВК баяліся крытыкаваць Марчэнка — старшыню РВК. Член партыі Ліўшыц (намеснік старшыні РВК) імкнуўся змазаць усе недахопы ў рабоце РВК. З 10 выбраных парторгаў — 3 упэршыню выбраны на партработу.

АБ ПЕРАХОДЗЕ НЕКАТОРЫХ КАЛГАСНЫХ ХУТАРСКІХ ДВАРОЎ НА ПРАЖЫВАННЕ Ў КАЛГАСНЫЯ ВЁСКІ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ЦК КП(б)Б

Ідучы насустрач пажаданням калгаснікаў і ў мэтах далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, у адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 31 студзеня 1937 г. № 167. Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. Дазволіць раённым выканаўчым камітэтам і раённым камітэтам КП(б)Б пералічаных ніжэй раёнаў ажыццявіць у 1937 годзе пераход на пражыванне ў калгасныя вёскі па 13.000 калгасных хутарскіх двароў, у тым ліку:

РАЁНЫ:	У колькіх калгасах	Колькі аб'ядняецца хутарскіх двароў
Бялыніцкі	15	240
Бярэзінскі	18	250
Барысаўскі	20	330
Багушэўскі	55	800
Бабруйскі	6	100
Брагінскі	4	80
Быхаўскі	11	160
Віцебскі	36	560
Гарадоцкі	30	400
Дзержынскі	18	290
Дрысенскі	24	300
Дубровенскі	70	1000
Жлобінскі	20	320
Кіраўскі	15	200
Клімавіцкі	16	200
Касцюковіцкі	6	90
Крычаўскі	15	200
Клічаўскі	8	130
Крупскі	6	90
Лельчыцкі	18	270
Лёзнянскі	30	400
Магілеўскі	23	350
Мсціслаўскі	45	700
Аршанскі	70	1100
Полацкі	40	600
Парыцкі	7	100
Пухавіцкі	20	320
Рагачоўскі	7	100
Расонскі	13	200
Сіроцінскі	24	360
Суражскі	44	620
Хоцімскі	8	100
Ўзданскі	24	360
Чэрыкаўскі	5	60
Чэрвеньскі	15	270
Чашніцкі	24	450
Шклоўскі	60	900

2. Адпусціць на першапачатковае абзавядзенне калгаснікам, якія пераходзяць у 1937 г. з хутароў на пражыванне ў калгасныя вёскі, трохгадовы трохпроцантны крэдыт у размеры 6,5 млн. руб. і трохгадовы трохпроцантны крэдыт адпаведным калгасам у размеры 800 тыс. руб. на дабрабыт. Адпусціць на адзін калгасны двор ад 450 да 550 руб. і на адзін калгас ад 750 да 1000 руб. крэдыта.

Запвердзіць размеркаванне крэдытаў па паасобных раёнах.

3. Дазволіць раённым выканаўчым камітэтам і раённым камітэтам КП(б)Б у межах устаноўленых сум і размераў выдачы вызначыць крэдыт для кожнага калгаса і калгаснага двара, выходзячы з эканамічнага становішча калгаса, становішча жылых і іншых будынкаў, якія падлягаюць пераносу на новыя сядзібы, і іншых момантаў, якімі вызначаецца кошт перасялення.

4. Для забяспечання калгасных хутарскіх двароў, якія пераходзяць на пражыванне ў калгасныя вёскі, адпусціць у 1937 годзе 152 тыс. кб. м. будаўнічага лесу на пні, у тым ліку з фондаў Кіраўніцтва лесаахоўны і лесанасаджэнняў 139,7 тыс. кб. м. і з фондаў Кіраўніцтва лясоў мясковага значэння Наркамзема 12,3 тыс. кб. м.

Запвердзіць размеркаванне лесу па асобных раёнах.

5. Абавязаць Кіраўніцтва лесааховы і лесанасаджэнняў і Кіраўніцтва лясоў мясковага значэння Наркамзема адпускаць лес па магчымасці з бліжэйшых лясных дач з аплатай 50 проц. папённай платы.

6. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты адпускаць лесаматэрыялы для калгасных двароў у залежнасці ад праўднай патрэбнасці, але не больш 15 кб. м. на двор.

7. Прапанаваць Кіраўніцтву лесааховы і лесанасаджэнняў і Кіраўніцтву лясоў мясковага значэння Наркамзема адпускаць лесаматэрыялы для лесасекі, даць указанні мясцам аб скарыстанні ў першую чаргу драўніны з раней адведзеных лесасек і вызваліць дадатковы лесасечны фонд з разлікам поўнага забяспечання перасяляючыхся калгаснікаў.

8. Зацвердзіць план вырабу ў 1937 годзе 30 млн. штук цаглы і 15 млн. штук чарапіцы для продажу калгасам і калгаснікам, у першую чаргу тым, якія перасяляюцца з хутароў у вёскі.

Устанавіць, што з гэтай колькасці 5 млн. штук чарапіцы вырабляецца на прадпрыемствах НК Мясковай прамысловасці, а 10 млн. чарапіцы і 30 млн. штук цаглы—у калгасах.

Абавязаць Дзяржплан, НК Мясковай прамысловасці і НК Земляробства распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па забяспечанню поўнага выканання гэтага плана і не пазней 3 красавіка ўнесці на запвержанне СНК.

9. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя камітэты КП(б)Б і праўленні калгасаў забяспечыць продаж цэглы, чарапіцы і вапны ў першую чаргу тым калгаснікам, якія перасяляюцца з хутароў у калгасныя вёскі.

10. Абавязаць НК Унутранага гандлю і Белкаапсаюз забяспечыць завоз шкла, цвікоў і іншых будаўнічых матэрыялаў, неабходных для поўнага задавальнення патраб калгасаў і калгаснікаў, якія перасяляюцца з хутароў у вёскі, па ўказаных вышэй раёнах.

11. Абавязаць НК Земляробства і раённыя выканаўчыя камітэты забяспечыць для калгасаў і калгасных двароў, якія перасяляюцца з хутароў у калгасныя вёскі, распланіроўку калгасных цэнтраў, адвод і нарэзку ў натуры сядзібных участкаў у размеры вышэйшай нормы, устаноўленай для гэтых раёнаў.

12. Абавязаць акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя земельныя аддзелы і праўленні калгасаў аказваць дапамогу калгасным дварам, якія перасяляюцца з хутароў у вёскі, прадастаўляючы ім бясплатна неабходную рабочую сілу і транспарт для перавозкі будынкаў і маемасці, заготовак і перавозкі будаўнічых лесаматэрыялаў на новую сядзібу. Абавязаць праўленні калгасаў і МТС аказваць калгаснікам дапамогу па расчыстцы, раскарчоўцы і ўспашцы зямлі на новых прысядзібных участках і ў перасадцы плодовых дрэў і ягаднікаў са старых прысядзібных участкаў на новыя прысядзібныя участкі.

13. Вызваліць калгаснікаў, якія перасяляюцца з хутароў у калгасныя вёскі, ад бульбапаставак з прысядзібных участкаў тэрмінам на 2 гады.

14. Абавязаць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў і загалчыкаў раённых земельных аддзелаў пры правядзенні мерапрыемстваў па перасяленню калгасных двароў з хутароў у вёскі аказваць калгаснікам і калгасам канкрэтную дапамогу, забяспечыўшы перасяляючыхся калгаснікаў на час разбору іх старых будынкаў на хутарах і пабудовы іх на новым месцы адпаведнымі жылымі і надворнымі будынкамі ў вёсках, у якія яны перасяляюцца.

15. Непасрэдная кіраўніцтва па перасяленню калгаснікаў з хутароў у калгасныя вёскі ўскласці персанальна на народнага камісара земляробства тав. Бенека, начальніка аддзела землеўпарадкавання НК Земляробства БССР тав. Фрылмана, а ў раёнах на першых сакратароў раённых камітэтаў КП(б)Б і старшынь раённых выканаўчых камітэтаў, загалчыкаў раённых земельных аддзелаў і дырэктароў МТС.

16. СНК БССР і ЦК КП(б)Б папярэджваюць усе совецкія і партыйныя арганізацыі раёнаў аб поўнай недапушчальнасці ўжывання якіх-бы та ні было мер адміністрацыйнага ўздзейнічання на калгаснасці пры пераходзе калгаснікаў з хутароў на пражыванне ў калгасныя вёскі.

Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і раённыя камітэты КП(б)Б правесці шырокую растлумачальную і арганізацыйна-гаспадарча-палітычным значэнні гэтых мерапрыемстваў і растлумачыць калгаснікам аб парадку і ўмовах пераходу на пражыванне ў калгасныя вёскі і аб тых ільготах і дапамозе, якія прадастаўляюцца парнікам і калгасам.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

31 сакавіка 1937 г. г. Менск.

ПУСТАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ

8 красавіка вечарам на сходзе актыва Наркаммясцпрома прадаўжаліся спрэчкі.

На папярэдніх пасяджэннях нямала крытыкавалі гаспадарнікі работу трэста Белторф і яго кіраўнікоў за безгаспадарчасць, вочкаўніцтва, ашуканне дзяржавы і інш. Між тым, выступаўшы з прамовай галоўны інжынер Белторфа тав. Сцепанаў ні слова не сказаў аб прад'яўленых яму абвінавачаннях, аб сваёй рабоце, як тэхнічнага кіраўніка трэста. Ён адзелаўся пустымі нікчэмнымі разважаннямі. У сваім выступленні дырэктар торфзавода «Чырвоны сцяг» тав. Хаскін прывёў дзесяткі новых фактаў агіднейшай работы кіраўнікоў Белторфа. Бюракратычна-чыноўніцкія адносіны да нізавых работнікаў, грубае адміністраванне, падхалімства і заціск крытыкі глыбока ўкарэнены ў апараце Белторфа.

Галоўны механік трэста Шунейка прысвайвае сабе чужыя вынаходствы і атрымлівае за гэта прэміі. Заводу «Чырвоны сцяг» запланавалі трэці паравоз, у той час, як тыя, што ёсць, поўнасцю не нагружаны. Бескарысна ўхлопалі многа грошай. У студзені прымушаюць рабіць дрэванасаджэнні, а капітальныя работы адкладваюць на няпэўны тэрмін. Кузняцоў пасылаў на завод на пасаду галоўнага інжынера ворагаў, п'яніц, жулікаў.

Парочнае кіраўніцтва Белторфа не «заўважалася» ўвесь час наркаматам.

З 62 запісаўшыхся выказалася на сходзе 42 чалавекі. Пераважная большасць выступаючых у спрэчках прыводзіла многа фактаў нікудышнай і безадказнай работы наркамата і трэстаў, але не здолела выкрыць яе карэнні, не зрабіла з іх ніякіх палітычных вываў. Аб гэтым не сказаў у сваім заключным слове і тав. Балцін.

У завяршэнне актыву быў прыпадчэсен сюрпрыз. Састрапалі кароценькую пустую, якая нічога не гаворыць рэзалюцыю. Ні слова самакрытыкі аб рабоце наркамата, аб палітычнай блізарукасці яго кіраўнікоў. Дзе дзеліся дзесяткі каштоўных прапаноў, унесеных выступаючымі гаспадарнікамі?

На жаль, гэта «разалюцыя» была праштампавана ўдзельнікамі схода. Кіраўнікі Наркамата мясковай прамысловасці самі змазалі работу важнейшага палітычнага схода.

І. ТУРЭЦКІ.

БЛАГАРОДНЫ ЎЧЫНАК

Цёмнай вясенняй ноччу настаўнік С. Рубанаў праходзіў па вуліцы калгаса імя Блюхера, Берэзінскага сельсовета. Раптам ён заўважыў, як абхапіла полымем дом калгасніка Л. Шыркіна. Настаўнік хутка падбег да дому калгасніка і разбудзіў яго сям'ю. Неапрануўшыся, сям'я ледзь паспела выскачыць з агню. Але тут, у 25 метрах ад гарэўшага дома, загарэлася страха дома гр-на Недасекіна. Рубанаў ускочыў на страху і сваім палітэ затушыў агонь. За благародны ўчынак прэзідыум чырвонапольскага РВК вынес падзяку настаўніку Рубанаву.

(«Чырвоны сцяг» — Чырвонапольскі раён).

ЗА КРЫТЫКУ ЗВОЛІЛІ З РАБОТЫ

На бярэзінскім спіртзаводзе я працую з 1917 года. Быў качагарам, а ў апошні час займаў пасаду механіка. З прыездам сюды новага дырэктара Зобіна мяне перавялі без усякіх прычын у памочнікі механіка, а на маё месца паставілі «свайго» чалавека Зайцава.

Дырэктар перадаверыў усё кіраўніцтва прадпрыемствам тэхнаруку Гаўрылаву і Зайцаву, а сам штампаваў без праверкі нарады работ. У рэзультаце на заводзе перавылатак па рамонтных работах на 105 тысяч рублёў. Рабочым ужо 4—5 месяцаў не выплачваюць зарплаты.

Зобін сам асабіста 2 разы зламаў верцікальную паравую машыну, і гэта абышлося заводу ў некалькі тысяч рублёў. Па віне Зайцава была зламана солададрабілка. Гэтыя ўчынкі ніхто замялі, каб ніхто аб іх не ведаў. Устаноўка цыстэрны для зліву спірту абышлася ў пяць тысяч рублёў, у той час, калі я сам у свой час гэту работу рабіў за 500 рублёў.

На агульным сходзе рабочых, калі бухгалтар Душэўскі зрабіў інфармацыю аб выніках галавой работы завода, я выступіў з крытыкай недахопаў у працы. З таго часу пачаліся ганенні на мяне. Чапляліся да кожнай дробязі.

24 студзеня, у мой выходны дзень, на заводзе сапсаваліся насосы. Качагар Паўлаў, як малакваліфікаваны, не ведаў, што рабіць. Кіраўнікі завода, не расследаўшы, хто-ж сапраўды віноўны ў гэтым, знялі з работы мяне і Паўлава. Я ўжо хаджу месяц без работы. Скарзіўся ў РКК — старшыня заўкома Барысаў адказаў, што справа накіравана следчым органам. Тое-ж самае мне сказалі ў пракуратуры. Так я нічога і не дабіўся.

Б. САЙКОЎСКІ.

ЯК У МОЗЫРСКІМ АКРВЫКАНКОМЕ РАЗУМЕЮЦЬ КРЫТЫКУ

Амаль два гады ўжо існуе пры Мозырскім акруговым выканаўчым камітэце насценгазета «Акрвыканкомавец». Выпускаецца яна нярэгулярна — адзін нумар у адзін-два месяцы. Матэрыял у газету збіраецца пераважна метадам «цвёрдых заданняў». У выніку крытыка ў газеце носіць бязазубы характар. За ўвесь час існавання газеты ў ёй не было ні аднаго допіса з крытыкай работы загадчыкаў аддзелаў або іншых кіруючых работнікаў апарата. Тут існуе няпісаны закон: «Начальства не крытыкаваць». Гэтым «законам» і кіруецца ў сваёй рабоце рэдкалегія газеты «Акрвыканкомавец». Рэагаванне на змешчаныя ў газеце допісы зусім слабае.

Нішто не парушала спакой у рэдкалегіі і яе адказнага рэдактара т. **Шылёнка.** Панавала поўнае зацішша і апартуністычная дабрадушнасць. Але вось у пачатку лютага гэтага года ў рэдкалегію паступіў допіс пад назвай «Наркамфін забараніў, ці асабістыя сімпатыі», у якім жорстка крытыкаваўся загадчык акруговага фінаддзела т. **Варшаўскі** за бюракратычныя, нячулыя адносіны да людзей і незаконнае прысваенне дзяржаўных грошай.

Атрымаўшы такі незвычайны допіс, рэдкалегія збянтэжылася: «Што рабіць? Гэта-ж крытыкуецца начальства — член прэзідыума акрвыканкома». Не змясціць допіс таксама нельга — загаворыць работнікі апарата. Адказны рэдактар газеты тав. Шылёнак (ён-жа сакратар АВК) накіраваў допіс на **«расследованне»**... самому Варшаўскаму. Яму перадалі напісаны на яго допіс і нават павядамілі прозвішча аўтара.

Праз некалькі дзён у насценгазеце з'явіўся допіс «Наркамфін забараніў, ці асабістыя сімпатыі» і побач з ім у **гэтым-жа нумары** газеты змешчан «вычарпальны», хлуслівы адказ Варшаўскага. Рэдкалегія замазала паказаныя ў допісу факты, аслабіла крытыку Варшаўскага.

Партыйная арганізацыя (сакратар парткома т. **Патапенка**) абышла гэты факт з поўным маўчаннем, не зрабіла з яго ніякіх вывадаў аб становішчы крытыкі і самакрытыкі ў апараце акрвыканкома. А яна ў Мозырскім акрвыканкоме далёка не ў пашане.

Комсамолец АНТАНЮК.

БРАКАРОБЫ

Менская шпалерная фабрыка праславілася на ўсю Беларусь як самая адсталая фабрыка. За 1936 год яна дала дзяржаве страт на суму 118.800 рублёў.

Галоўная прычына зрыву выканання вытворчага плана крыецца ў дрэнным кіраўніцтве фабрыкі. Досыць сказаць, што нават за прадукцыяй, якую выпускае фабрыка, няма ніякага гаспадарчага нагляду. Напрыклад, ёсць вялікі адыход добраякаснай шпалернай паперы ў рулонах і ў зрыве, даўжынёй ліста ад 8 да 500 метраў. Гэта тут лічаць бракам. У той час, як гэты адыход магчыма было-б скарыстаць для вырабу шпалераў.

Апрача таго, на складзе фабрыкі добраякасныя шпалеры прыводзяцца ў нягоднасць, бо ў ім вільготна і сыра. А часта бывае так: рабочыя скарыстоўваюць рулоны паперы замест крэслаў.

Усё гэта мала трывожыць Наркаммясцпром і кіраўніцтва Белпаліграфтраста.

І. З.

ЗАЯДЛЫ СЛЕДЧЫ І ЯГО ЗАСТУПНІК

Было 12 гадзін ночы. Жонка следчага жлобінскага раёна Яцука падышла к краме і пачала стукаць у дзверы. Крамнік Песін (які рабіў уборку) вышаў і сказаў, што крама ўжо зачынена. Здавалася-б, справа ясная. Аднак, праз некалькі мінут каля крамы з'явіўся следчы Яцук (ён быў па суседству ў рэстаране), якому, відаць, жонка паведаміла аб «грубасці» крамніка.

— Следуйце за мной,— загадаў Яцук крамніку.

— Куды?

— Без размоў. За мной, — камандаваў следчы.

Крамнік Песін убачыў, што справа ідзе аб арышце і напомніў заяўламу следчаму аб 127 артыкуле Сталінскай Канстытуцыі.

Яцук рашыў выправіць сваю «памылку». Ён загадаў Песіну на другі дзень зайсці к яму, Яцуку, у пракуратуру.

На другі дзень Песін прышоў. Тут крамніку прышлося выслухаць доўгую нагацыю ад следчага, як трэба адносіцца да жонак судовых работнікаў.

Пакрыўджаны крамнік зайшоў да райпракурора т. Леінава. Той зрабіў вывад:

— Калі Яцук загадаў табе ісці, дык трэба было ісці, вось тады была-б справа. А так як ты не пайшоў, ну дык няма аб чым і гаварыць.

Так рашыў пракурор. Але нам здаецца, што ў даным выпадку «мухрае» рашэнне пракурора не павінна вычарпаць пытанне.

І. З.

На шахце «Красный Октябрь» (Данбас) працуюць сумесна бацька і сын Баброўнікавы. Стаўшы на стаханаўскую вахту імя тав. Орджанікідзе, бацька выканаў 707 проц. нормы, а сын 601 проц. НА ЗДЫМКУ: Якаў Васільевіч і Іван Якаўлевіч Баброўнікавы ў сябе дома.

Фото М. Дувінскага (СФ).

КАШТОЎНАЕ ПАЧЫНАННЕ

У сям'ю чырвонаармейца І. Я. Клімовіча, якая пражывае ў Менску па Чыгуначнай вуліцы, д. 63, кв. 4, прышоў дэпутат горсовета тав. Раеўская. З'яўленне дэпутата для сям'і было нечаканасцю. І не дзіва... У Менску вельмі мала знойдзецца такіх сямей, да якіх заходзілі дэпутаты і дапамагалі ім, цікавіліся іх жыццём. Тав. Раеўская хутка паведаміла, што яна прышла па даручэнню абаронней секцыі горсовета даведацца, як жыве сям'я чырвонаармейца і ў чым мае патрэбу. Бацька сям'і — пупілы абходчык Я. К. Кліховіч—расказаў дэпутату горсовета аб жыцці радавой совецкай рабочай сям'і, адзін сын якой вось ужо другі год ахоўвае недатыкальнасць далёкаўсходніх граніц нашай радзімы.

У выніку праведзенай гутаркі дэпутат горсовета склала падрабязны даклад, які заканчваецца наступным:

— Сын служыць у радах РСЧА на далёкім Усходзе. Сувязь з сям'ёй падтрымлівае шляхам перапіскі. У сваіх пісьмах ён піша, што задаволен сваёй службай і ганарыцца тым, што на яго долю выпаў гонар ахоўваць далёкаўсходнія граніцы нашай радзімы. Бацька чырвонаармейца Клімовіча заявіў, што яго сям'я ні ў чым не мае патрэбы, але ён вельмі задаволен тым, што совецкая ўлада ў асобе дэпутата горсовета цікавіцца жыццём сям'і чырвонаармейца, аб чым ён у першым-жа пісьме паведаміць свайму сыну.

У гэты-ж прыблізна дзень каля 150 дэпутатаў горсовета наведалі і іншыя сем'і чырвонаармейцаў Менска. Яны прышлі з адным заданнем—выявіць патрэбы сямей чырвонаармейцаў і потым неадкладна ім дапамагчы. Характэрная дэталь. У добрай паловы сямей (а іх было абследвана каля 400) дэпутаты атрымалі такі-ж адказ, як і ў сям'і Клімовіча. «Маючы ўсяго аднаго работніка, які атрымлівае 300—400 руб. у месяц, — піша дэпутат Міскевіч,— сям'я чырвонаармейца Багдановіча Л. Ф. (Чырвонаармейская, дом 9, кв. 15) добра забяспечана. Ёсць кабанчык і 5 курэй. Маці чырвонаармейца Багдановіч Анастасія гаворыць, што сям'я жыве вельмі добра і ні ў чым не мае патрэбы».

У ліку абследаваных сем'яў знайшліся і такія, якія прасілі дапамогі. У чым-жа яны просяць дапамагчы? Вялікая частка сем'яў, просячых дапамогі, хоча, каб ім устанавілі радыёпрыёмнікі і т. д. Другія просяць дапамагчы дастаць матэрыялы для рамонту кватэр, або адрамантаваць кватары.

Дэпутат Кавалевіч адзначыў факт бязгушных адносін да сям'і чырвонаармейца. Вось што ён піша: «62-гадовы бацька-пенсіянер чырвонаармейца Іван Францавіч 3 месяцы ляжыць у ложку хворым. Жонка працавала прыбіральшчыцай на фабрыцы імя Крупскай, але ўрач для догляду за хворым аддала ёй у выдачы бюлетэня, а пакінуць без догляду хворага нельга. Так старыкі і асталіся існаваць на мізэрныя сродкі. У лютым, спецыяльна для накіравання бацькі ў лячэбную ўстанову, прыязджае з арміі сын. Пасля раду клопатаў, хтосьці ў горсовеце і горздраве заверыў, што праз два дні хворага бацьку возьмуць у больніцу. Прайшло ўжо два тыдні, як паехаў сын, а бацька ўсё яшчэ ляжыць у выключна цяжкіх умовах».

Праўда, праз галовы горздрава тав. Кавеліч неадкладна дабіўся таго, што старога Яглоўскага палажылі ў больніцу, а яго жонцы да ўстанаўлення пенсіі горсовет выдаў адначасовую грашовую дапамогу.. Паўстае пытанне, чаму горсовет да гэтага часу не ведаў, што ў горадзе ёсць такая сям'я чырвонаармейца і не дапамог ёй своечасова.

Па выніках абследвання сямей чырвонаармейцаў зараз горсовет намеціў сабраць усіх кіраўнікоў тых устаноў і арганізацый, якія непасрэдна павінны праводзіць у жыццё патрэбы сямей. Але нарада гэта з дня на дзень запягваецца. Марудзіць тут не прыходзіцца. Карыснае пачынанне дэпутатаў Менскага горсовета трэба неадкладна давесці да канца.

ВІШНЕЎСКІ.

ЗАМЕСТ САМАКРЫТЫКІ КЛОПАТЫ АБ ГОНАРУ МУНДЗІРА

На Беларускай чыгунцы доўгі час арудвала шайка трацкісцкіх дыверсантаў і шпіёнаў. Атаман гэтай банды, стаўленік расстрэлянага Ліўшыца — Влазімірскі займаў пост начальніка Беларускай чыгункі. Па суседству, пад адным дахам з Влазімірскім знаходзіўся палітаддзел Беларускай чыгункі, габінеты начальніка падора тав. Панамарова і яго намесніка Шульмана.

Влазімірскі і палітаддзел жылі як добрыя суседзі. Агент гестапо пускаў пад адкос цягнікі, псаваў дарогі, а палітаддзельцы, страціўшы большэвіцкую пільнасць, рэгістравалі акты шкодніцтва, як выпадковыя здарэнні. Іх асабліва не хвалявалі шматлікія трывожныя сігналы чэсных чыгуначнікаў, друку. На пісьмы і скаргі рабочых палітаддзел адказваў бюракратычнай апіскай.

Палітаддзел, у прыватнасці тав. Шульман, рэўніва, падхалімскі ахоўваў спакой ворага народу дыверсанта Влазімірскага. Адной ды рэдакцыя газеты «Железнодорожник Белоруссии» паслала Влазімірскаму пісьмо жонкі чыгуначніка, палітэмігранткі Журомскай аб няправільным, злачынным высяленні яе з кватэры. Влазімірскі, як і належыць контрэвалюцыянеру, грэбліва адмахнуўся ад пісьма і прапанаваў палітаддзелу чыгункі растлумачыць рэдакцыі газеты на яе «нетактычнасць».

Шульман рад старанна. Разгневаны намеснік нач. палітаддзела дарогі Шульман узняў пытанне аб пакаранні тых работнікаў рэдакцыі, якія асмеліліся паслаць скаргу чыгуначніка начальніку дарогі Влазімірскаму. Ён нават патрабаваў за такое «злачынства» знять загалчыка аддзела пісем рэдакцыі т. Гізунтэрмана з работы. Шульман зарэкамендаваў сябе як падхалім і зажымшчык самакрытыкі.

Пасля апублікавання рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) комуністы кіраўніцтва дарогі, у прыватнасці комуністы рэдакцыі газеты, якія больш другіх ведалі аб праделках Шульмана, на першым-жа партсходзе выступілі з жорсткай крытыкай работы Шульмана. Аднак Шульман не з такіх, якія схільны прыслухоўвацца да голасу масы, якія па-большэвіцку прызнаюць свае памылкі.

На партсходзе Шульман кожнаму, хто выступаў аб яго памылках, кідаў абражаючыя рэплікі, не даваў гаварыць. Партком, падхалімнічаючы перад «начальствам», звёў выступленні, крытыкуючыя Шульмана, на нішто. У сваім выступленні зарваўшыйся самадур асмеліўся правільную крытыку яго антыпартыйных дзеянняў аб'явіць паклёпам на палітаддзел. Адным словам, крытыка на гэтым сходзе не атрымала ходу.

Праз некалькі дзён у цэнтральнай чыгуначнай газеце «Гудок» з'яўляецца заметка: «Почему неразостно т. Шульману».

У гэтай заметцы было напісана літаральна наступнае: «Каб запісаць рот выступаючым, Шульман у сроках не спяшаўся. Выступленне Кучынскага, які заявіў, што ў партарганізацыі ўпраўлення да гэтага часу не было самакрытыкі, квітнелі падхалімства і ўгодніцтва, Шульман расцаніў, як антыпартыйнае, трацкісцкае» («Гудок» ад 20 сакавіка 1937 г.).

Шульман не абмежаваўся грозным выступленнем на партсходзе. Ён, як начальнік, выклікаў да сябе падпаралкавання яму рэдактара газеты «Железнодорожник Белоруссии» тав. Новікава і заявіў апошняму, што ў рэдакцыі стварылася група, якая жадае прынізіць яго, Шульмана, аўтарытэт. Гэта было па сутнасці дырэктывай спыніць крытыку, і ад начасова пагрозай па адрасу рэдакцыі.

Аднак, крытыка не спынілася. Тады ён прыбягае да другога метада, метада апарочвання тых, хто правільна, па-большэвіцку крытыкуе яго. Шульман пішэ ў газету «Рабочий» артыкул: «Газета, потерявшая партийное лицо». У гэтым артыкуле Шульман абвінавачвае газету ва ўсіх грахах і нават у садзейнічанні шкодніцтву. Шульман свядома ўмаўчаў, што за памылкі газеты ён асабіста нясе поўную адказнасць, таму, што ён як зам. нач. падора асабіста нясе адказнасць за работу свайго органа. Хіба гэта не паказвае Шульмана, як крывадушнага і заціскаючага самакрытыку?..

Шульман так заканчвае свой артыкул: «Чэснасць у палітыцы ёсць рэзультат сілы, крывадушнасць —рэзультат слабасці» — гаварыў тав. Ленін. Рэдакцыя «Железнодорожник Белоруссии» ў сваёй рабоце арыентуецца не на чэснасць, а на крывадушнасць» («Рабочий» ад 26 сакавіка 1937 г.).

Гэта палажэнне зусім правільна, толькі там, дзе напісана: «рэдакцыя «Железнодорожник Белоруссии» павінна быць напісана: «Шульман».

Перад намі цэлая пачка выразак з газеты «Ж. Б.», якая, пачынаючы з верасня 1936 года, 17 разоў пісала аб тым, што ў Асіпавіцкім аддзяленні чыгункі арудуе вораг. Газета называла і прозвішча шкодніка Ракава, які быў намеснікам начальніка Асіпавіцкага аддзялення. Палітаддзел дарогі ігнараваў гэтыя сігналы. Больш таго, Шульман даў указанне рэдакцыі не непакоіць крытыкай чэснага работніка Ракава і палітаддзел Асіпавіцкага аддзялення. Гэта дало магчымасць шкодніку Ракаву тварыць дыверсійныя акты да самага апошняга часу, пакуль ён не быў выкрыт адпаведнымі органамі.

Яшчэ ў верасні 1936 года (25/IX—37 г.) асабіста Шульману паступіў з Канатопа матэрыял, сігналізуючы аб тым, што начальнік аддзела кадраў Беларускай чыгункі Рэнскі актыўны трацкіст. Шульман замарынаваў гэты матэрыял. Толькі ў апошні час з дапамогаю супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «Железнодорожник Белоруссии» ўдалося сарваць маску з ворага народу Рэнскага.

Усё гэта сцвярджае, што ў палітаддзеле чыгункі яшчэ па-сапраўднаму не ўзяліся за барацьбу са шкодніцтвам, за выкарчоўванне карэнняў гэтага шкодніцтва. Работнікі палітаддзела чыгункі замест большэвіцкай самакрытыкі сваёй бескланотнасці ў барацьбе з вынікамі шкодніцтва лічаць за лепшае берагчы гонар уласнага мундзіра, заціскаць самакрытыку.

Антыпартыйнай практыцы Шульмана трэба пакласці канец.

П. ЧЫКУН.

г. Гомель.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ „ЗВЯЗДЫ"

«ВОРАГІ НАРОДУ АРУДУЮЦЬ НА ТОРФЗАВОДЗЕ «СВАБОДА»

Пад такім загалоўкам у Звяздзе» ад 2 лютага была змешчана карэспандэнцыя аб варожай дзейнасці трацкістаў Шкляра і Басіна на торфзаводзе «Свабода», Асіпавіцкага раёна.

Адзначаныя факты ў карэспандэнцыі пры праверцы Асіпавіцкім райкомам КП(б)Б і Белторфтрэстам поўнасцю пацвердзіліся. Зараз загадам па трэсту Шкляр і Басін зняты з работы. Загалчыку аддзела кадраў завода, члену партыі Баравіку за гнілаліберальныя, прымірэнчаскія адносіны да варожай дзейнасці трацкістаў Шкляра і Басіна райкомам КП(б)Б абвешчана суровая вымова. Пракурору раёна тав. Лейланду даручана тэрмінова правесці следства аб фактах здзекванняў над рабочымі і вінаватых прыцягнуць да адказнасці.

Ю. М. ПЭН, ЯК МАСТАК-РЭАЛІСТ

Юрый Майсеевіч Пэн нарадзіўся ў 1856 годзе ў Ковенскай губерні ў беднай яўрэйскай сям'і. Рана пакінуўшы сям'ю, Пэн ідзе на заработкі да гаспадароў-маляроў у Дзвінск і іншыя гарады. Цяжкі быў шлях Пэна, пакуль ён не трапіў у 1885 годзе ў Пецярбург у Акадэмію мастацтваў, займаючыся ў прафесара Лаўрэцкага і Чысцякова.

Скончыўшы ў 1890 годзе Акадэмію, Пэн пасяляецца ў 1897 годзе ў Віцебску, дзе і працуе да сваёй смерці.

Пэн за сваё жыццё стварыў звыш 800 палотнаў. Гэта выключна пладатворны мастак. Амаль усе свае палотны ён захаваў у сябе на кватэры і перад смерцю выказаў жаданне перадаць іх совецкай дзяржаве.

Цярпячы бяспраўе, холад і голад, кормячыся бульбай і селядцом, церпячы шмат іншай бяды пры царскім ладзе, Пэн не паставіў сваё мастацтва на службу буржуазіі, не прадаў ёй сваіх колькі-небудзь значных работ. Усе свае асноўныя работы ён захаваў працоўным БССР.

Пэн яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі стварыў мастацкую школу, адзіную ў Беларусі, дзе сам вёў педагагічную работу, стварэючы кадры мастакоў для краіны.

Вядома, Пэн, пражыўшы без малага 90 год, не ўсю сваю творчасць прысвяціў совецкаму перыяду.

Ён гэтага зрабіць не мог. Вядома, у работах Пэна і за совецкі перыяд былі таксама свае недахопы, іх мы таксама ведаем, але не аб іх зараз ідзе гутарка.

Зараз мы даем апэнку ўсяму яго творчаму шляху, падводзім яго вынік.

Пэн — буйнейшы мастак, галоўным чынам, пяжкага мінулага народаў Беларусі.

Мы бярэм ад мінулага ўсё, што ёсць каштоўнага і, крытычна пераапрацоўваючы, выкарыстоўваем гэта мінулае для нашага пяцярэшняга, аб чым нам указваў В. І. Ленін, аб чым не раз нам указваў таварыш Сталін.

Тым больш, што мінулае ў Пэна, гэта—наша мінулае, мінулае народаў Беларусі.

І. СУРТА

Ленін указваў, што комуністычная культура вырастае з лепшага, што стварыла чалавечая культура за ўвесь час гісторыі.

На гэтым аснаваны нашы стаўлёчыя адносіны да такіх вялікіх майстраў культуры мінулага, як Пушкін, або як мастакі Рэпін, Сурыкаў, Сероў, Айвазоўскі і інш., як гіганты эпохі адраджэння: Мікель-Анджэла, Леанарда-да-Вінчі, потым Рэмбрант і найвялікшыя майстры нават стараўніх вякоў, як Праксіцель і інш.,—усе яны з'яўляюцца нашай спадчынай.

Пэн — маляваў мінулае, пераходзячае ў наша сучаснае, у наша сёнешняе, сённяшняе БССР.

Пэн — наш таму, што ён умела маляваў жыццё пераважна бяднейшых пластоў насельніцтва, прыгнечаных капіталістычным і нацыянальным рабствам, разбітым пасля пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў рабочым класам Расіі.

Сюжэты сваіх палотнаў мастак браў, галоўным чынам, з жыцця яўрэйскіх прапоўных пластоў насельніцтва — яўрэйскай беднаты — рабочых і саматужнікаў: ткачыкароў, краўцоў, хлебапёкаў, чаўцыкоў, музыкантаў і т. п.

За дарэвалюцыйны перыяд, жывучы ў непамерна пяжкіх умовах, Пэн стварыў многа буйных палотнаў. У перыяд 1903—1905 гадоў Пэн фарміруецца, як буйны мастак. У гэты час ён стварае «Развод», «Пісьмо з Америкі», «У турме», «1905 год» і інш.

У карціне «Развод», над якой ён працуе каля 10 год, мастак паказаў яркую бытавую драму, даўшы рад незвычайных тыпаў пяжкага мінулага, дасканалых жанчын. У карціне «1905 год» мастак дае падзею пасля вулічнага бою, калі смяротна ранены сын ляжыць з перабязанай галавой, бацька сядзіць у глыбокай думе, а маці спяшыць прадаць апошні скарб, каб купіць сыну лякарства.

У творчасці Пэна мы маем яшчэ адну важнейшую асаблівасць, што толькі пасля Кастрычніка 1917 года і ў яго рэзультаце наступіў поўны росквіт творчасці мастака, з'явіліся яго лепшыя творы.

Ён стварае жанр партрэта-карціны: «Бетховен» (1925 г.), «Сват» (1926 г.), «Музыкант» (1926 г.), «Кольец» (1926 г.), «Швея» (1927 г.), «Хлебапёк» (1928 г.), «Карабейнік» (1928 г.), «Піонер» (1928 г.), «Кавальскі пэх» (1930 г.) і інш.

Да ліку найбольш выдатных рэбут мастака (праўда, пры беглым агляде збору яго карцін) можна аднесці яго карціну «Маркс» і «Бетховен». Выдатны таксама па выразнасці «Часаўшчык», «Швея», «Піонер», «Сват», «Развод», «Старушка». Як многа агульных рысаў у «Старухі» Пэна з рысамі «Старушкі» Рэмбранта! Тут відаць прамы ўплыў рэалізма Рэмбранта на работы Пэна.

Партрэт Маркса дан у некалькі ідэалізаваным выглядзе, але з якой прапісклівай любоўю ён дан, з якім веданнем сваёй справы, з якім велізарным мастацкім майстэрствам выпісана кожная рыса, кожная дэталь гэтага партрэта! У партрэце Маркса Пэн паказаў, як па-майстэрску ён валодаў кісцю буйнейшага мастака.

Пэн стварыў свае лепшыя палотны таму, што ў аснову сваіх твораў ён паклаў для яго часу адзіна правільны метад мастацкага рэалізма. Таму яго творы жыццёвы.

Пэн маляваў не проста ўсякіх людзей, а браў іх характэрнае гістарычна складаўшаеся асяроддзе, ствараючы тыпы людзей гістарычнага мінулага Беларусі. Пэн, як чалавек вялікай культуры, увязваў сваё майстэрства з лепшымі ўзорамі мінулага, як Рэмбрант, як «перасоўшчыкі» ў Расіі, Рэпін і інш.

«Было-б вельмі пажадана, каб людзі, стаяўшыя на чале партыі руху—ці да рэвалюцыі, у тайных таварыствах, або руху, ці пасля яе, у якасці афіцыйных асоб — былі, нарэшце, намалёваны суровымі рэмбрантаўскімі фарбамі ва ўсёй сваёй жыццёвай яркасці. Усе існуючыя апісанні ніколі не малююць гэтых асоб у іх рэальным выглядзе, а толькі ў афіцыйным выглядзе, з катурнамі на нагах і з арэолам вакол галавы. У гэтых намаляваных рафаэлеўскіх партрэтах прападзе ўся праўдзівасць вобраза» (Маркс, т. VIII, стар. 293).

У другім месцы Маркс таксама гаворыць: «Рэмбрант пісаў Мадонну з ірландскай сялянкі» (Маркс, т. 1, стар. 178).

Як бачым, Маркс, вылучаючы рэмбрантаўскі рэалізм, як адлюстроўваўшы жывое жыццё, процістаўляючы яго рафаэлеўскай капоўшчыне, тым самым звязвае рэалізм мастацкага майстэрства Рэмбранта з філасофскім матэрыялізмам.

Пэн каштоўны і таму, што, увайшоўшы ў совецкі перыяд, не прайшоў міма яго, а стварыў рад незвычайных твораў, як «Маркс» «Ленін», «Комсамолец», «Піонер», «Кавальскі пэх» і інш.

Вось чаму творчасць Пэна значыма для нас і будзе значыма для наступных нашых пакаленняў.

Вось чаму да яго цягнуцца сімпатыі працоўных БССР, вось чаму наш урад і совецкая грамадскасць адзначаюць мастаку такую пашану, ганарацца ім, як сваім незвычайным мастаком, як адным з будаўнікоў нашай мастацкай культуры.

Вядома, гэту, так сказаць, першапачатковую форму рэалістычнага метада мы адрозніваем ад больш высока развітай яго формы — сацыялістычнага рэалізма, як творчага метада паказу нашай рэволюцыйнай, совецкай рэчаіснасці, паказу жыцця сацыялістычнага грамадства.

Вялікі пролетарскі пісьменнік А. М. Горкі, адрозніваючы гэтыя дзве формы рэалізма, называючы першую форму рэалізма «крытычным рэалізмам», так вызначаў яго сутнасць:

«Трэба засвоіць, што крытычны рэалізм узнік, як індывідуальная творчасць «лішніх людзей», якія, будучы нездольны да барацьбы за жыццё, не знаходзячы сабе месца ў ім і больш або менш выразна ўсведамляючы бязмэтнасць асабістага быцця, разумелі гэту бязмэтнасць толькі як бессэнсоўнасць усіх з'явішчаў сацыяльнага жыцця і ўсяго гістарычнага працэса».

— Ні ў якім разе не адмаўляючы шырокай велізарнай работы крытычнага рэалізма, высока апяваючы яго фармальныя дасягненні ў мастацтве жывапісі, словам, мы павінны зразумець, што гэты рэалізм неабходны нам толькі для асвятлення перажыткаў мінулага, для барацьбы з імі, вытраўлівання іх.

— Але гэта форма рэалізма не паслужыла і не можа служыць выхаванню сацыялістычнай індывідуальнасці, бо ўсё крытыкуючы, яна нічога не сцвярджала, або—у горшых выпадках — звярталася да сцвярджэння таго, што ёю-ж адмаўлялася» (А. М. Горкі. Даклад першаму з'езду совецкіх пісьменнікаў).

Гэта Горкі адносіў да творчага метаду ў літаратуры, але гэта мае адносіны і да такога выгляду мастацтва, як жывапіс.

Вось аб якой форме рэалізма ідзе гутарка, калі мы гаворым аб творчым метадзе, скажам Рэпіна і яму падобных мастакоў.

Творчы метад Пэна ёсць метад у асноўным таго-ж парадку. Вось чаму нас цікавіць гэты метад і ўсё тое лепшае, што створана на яго аснове, як у далёкім мінулым, так і ў мінулым блізкай да нас гістарычнай эпохі.

Навуковае, філасофскае значэнне гэтага метада састаіць у тым, што творчы рэалістычны метад у літаратуры і мастацтве— хочуць ці не хочуць таго мастакі і літаратары — а ён звязан са стыхійным матэрыялізмам, з матэрыялістычнай філасофіяй тых-жа эпох.

І чым гэта сувязь шчыльней, тым каштоўней для чалавецтва самі гэтыя мастацкія творы. Мы, марксісты, вядома, адрозніваем наш творчы метад у літаратуры і мастацтве ад усіх іншых, сцвярджаючы яго, як метад сацыялістычнага рэалізма, як метад, які аллюстроўвае лучшае сацыялістычнага грамадства, які песна звязан і вырастае на аснове апрацаваючай яго філасофіі — дыялектычнага матэрыялізма.

Сучаснае становішча буржуазнай культуры і яе мастацкай часткі, напрыклад, жывапісі, прышло ў паўнейшы заняпад, выпякаючы з загнівання самога капіталізма.

Фашызм растаптаў ботам пераладаную частку культуры мінулага, ён разбурае мастацкі скарб сусветнай жывапісі, як палац герцага Альба і інш.

Толькі ў нашай совецкай краіне—СССР—сапраўдная чалавецкая культура знайшла сваю радзіму, беражна захоўваецца, перадаецца пакаленням, развіваецца ў яе вышэйшую форму — у совецкую сацыялістычную культуру, у культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зместу.

Калі мы бярэм такую яе частку, як совецкая жывапіс, — мы можам сказаць, што лепшы сусветны скарб жывапісі, як «Эрмітаж», як «Трэцякоўская галерэя», як «Рускі музей» (Ленінград), як «Музей выяўленчых мастацтваў» і многія іншыя мае СССР. У БССР ёсць выдатны музей імя Луначарскага (Гомель), картынная галерэя Пэна (Віцебск) і інш.

У СССР няма больш або менш буйнага рэспубліканскага і абласнога тэатра, дзе-б не было мастацкай галерэі, палаца, музея, дзе-б не было мастацкай майстэрні, дзе-б тысячы працоўных не далучаліся да самых высокіх форм культуры, мастацтваў, навукі.

Мастацкія выстаўкі апошніх год, як, напрыклад, грандыёзная выстаўка, прысвечаная Чырвонай Арміі, пушкінскія выстаўкі, выстаўкі народнай творчасці, выстаўка пагранічнікаў БССР, выстаўкі асобных мастакоў — усё гэта гаворыць аб найвялікшым росце совецкай культуры, аб росце яе культурных кадраў, аб культурным росце многамільённых мас народаў СССР.

Вось чаму мы любім нашу культуру, нашу навуку, наша мастацтва.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі мастакі СССР зробяць тварэнні яшчэ большага, чым іх папярэднікі, высокага мастацкага майстэрства, яшчэ больш глыбокага ідэйнага зместу ў духу вялікага вучэння Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, у духу комунізма.

Вялікая Сталінская Канстытуцыя забяспечвае для нашай малазой мастацкай культуры БССР найвялікшы росквіт. І мы ўпэўнены, што ў недалёкім будучым, вучачыся на ўзорах сучаснага, на змену ўходзячаму прыйдуць нашы маладыя мастакі і створаць сапраўдныя шэдэўры мастацтва, дастойныя сацыялістычнай эпохі вялікага Сталіна!

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

АГЛЯД ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Апошнія два тыдні вайны ў Іспаніі характарызуюцца заціштам на мадрыдкім фронце, як на ўчастку ракі Харамы, так і ў раёне Гвадалахары, і значным ажыўленнем ваенных дзеянняў на паўночным і паўднёвым франтах.

На паўночным фронце ўрадавыя войскі ў раёне на паўднёвы ўсход ад Більбао на працягу некалькіх дзён адбіваюць бесперапынныя жорсткія атакі войск мяцежнага генерала Мола. Войскі мяцежнікаў узмоцнены магутнымі мотамеханізаванымі часцямі і шматлікай авіяцыяй, у тым ліку 40 бамбавозамі. Германскія і італьянскія інтэрвенты ўзброілі мяцежнікаў сваёй багатай тэхнікай.

У гэтым раёне сканцэнтраваны асноўныя сілы фашысцкіх войск на поўначы Іспаніі. Упартыя, крывавыя баі ідуць на ўчастку Очандыяна — Дуранго (на паўднёвы ўсход ад Більбао — галоўнага горала краіны баскаў). Карэспандэнты англійскіх газет паведамляюць, што ўрадавыя войскі ўтрымліваюць зараз другую лінію абароны ў горных праходах і ўсямерна ўмацоўваюць абарону Більбао. Мяцежнікі робяць адчайныя спробы прарваць фронт.

Іх мэта — па-першае, сарваць наступленне рэспубліканскіх войск на «сталіцу» мяцежнікаў Бургос, па-другое — шляхам ўзяцця Більбао і заваяваннем паўночнай Іспаніі атрымаць магчымасць перакінуць на мадрыдскі фронт свае сілы ў колькасці не менш 50 тыс. чалавек.

З вялікім поспехам для рэспубліканцаў развіваюцца ваенныя аперацыі на паўднёвым фронце — на поўнач ад Кардовы.

За 8 дзён урадавыя войскі прасунуліся на поўдзень ад Пасабланка амаль на 60 кілометраў. Урадавыя войскі імкнуцца акружыць з усіх бакоў горад Пеньяроя. Яны знаходзяцца на адлегласці 7—8 кілометраў ад гэтага важнага стратэгічнага пункта. Войскі рэспубліканскага ўрада шчыльна падыйшлі да ўскраін г. Вільяарта.

Карэспандэнты французскіх і англійскіх газет адзначаюць, што за апошнія дні на поўдні мяцежнікі папярэдзілі самы буйны разгром за ўвесь час вайны на гэтым фронце.

Рэспубліканцы імкнуцца шляхам наступлення перашкодзіць заняцию мяцежнікамі Альмаданскіх рудзікоў, прарваць камунікацыйныя лініі мяцежнікаў паміж Кардовай і Бадахосам і заняць заходнюю частку правінцыі Бадахос.

Каб папярэдзіць пагрозу камунікацыям паміж Андалузіяй і Эстрэмадурай мяцежнікі пачалі з Бадахоса дыверсійнае наступленне, імкнучыся адцягнуць сілы рэспубліканцаў. Аднак усе атакі фашыстаў адбіты.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), 8 красавіка. (БЕЛТА). На біскайскім фронце, у сектары Очандыяно (на паўднёвы ўсход ад Більбао) мяцежнікі пры актыўным падтрыманні авіяцыі і матарызаваных і механізаваных часцей прадаўжаюць атакі пазіцый рэспубліканцаў у раёне Барасар. На паўночны захад ад Очандыяно мяцежнікі пашталілі лес, прымусіўшы рэспубліканскія войскі перайсці на новыя пазіцыі. Па дарозе з Очандыяно да перавала Дзіма рэспубліканцы, затрымаўшы праціўніка, перайшлі ў контратаку і заняілі адну вышыню ў сектары Эйбар.

Учора авіяцыя мяцежнікаў тры разы бамбардыравала горад Більбао. Праследуемыя рэспубліканскімі знішчальнікамі, самалёты мяцежнікаў скрыліся ў воблаках і скідалі бомбы, не прычыніўшы ніякіх разбурэнняў.

На Сантандэрскім фронце (Сантандэр — порт на ўзбярэжжы Біскайскага заліва) мяцежнікі прадпрынялі атаку на захвачаныя ў іх нядаўна пазіцыі ў Сархентэс. Пасля доўгага бою атака мяцежнікаў была адбіта. Мяцежнікі пакінулі на полі бою шмат забітых і раненых.

На працягу ўчарашняга дня самалёты мяцежнікаў чатыры разы з'яўляліся над горадам Сантандэр. Самалёты бамбардыравалі аэрадром і населеныя пункты. Чалавечых афяр няма.

* * *

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае наступную радыёграму рэспубліканскай калоны імя Дуруці, якая дзейнічае на арагонскім фронце:

«Рэспубліканцы на працягу ўчарашняга дня энергічна наступалі па ўсяму фронту сектара Уэскі. Пасля жорсткіх баёў рэспубліканцамі заняты важныя пазіцыі, якія пануюць над усімі шляхамі зносін гэтага горада. Непрыяцель прадпрыняў контратакі, але ўсюды быў адбіт з вялікімі для яго стратамі.

* * *

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 8 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае барселонскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, тры тысячы мяцежнікаў пры падтрыманні авіяцыі і артылерыі імкнуліся прарваць фронт урадавых войск у раёне Уэскі (арагонскі фронт), аднак папярэдзілі няўдачу.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 8 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, у сектары Пеньяроя прадаўжаецца наступленне рэспубліканскіх войск у напрамку Фуэнтэ Овехуна (за 2 кілометры ад чыгункі Кардова—Пеньяроя). Лік палонных усё расце. У сваіх паказаннях усе палонныя сходзяцца на тым, што 6 красавіка быў для мяцежнікаў днём сакрушальнага паражэння. Амаль усе афіцэры мяцежнікаў былі забіты.

Учора мяцежнікі сем раз імкнуліся прадпрыняць контратакі, але былі кожны раз адбіты з цяжкімі для іх стратамі.

* * *

ПАРЫЖ, 9 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што рэспубліканскія войскі, якія дзейнічаюць у раёне Бласкес, на паўночны захад ад Пеньяроя (фронт Кардовы), устанавілі кантакт з урадавымі войскамі, якія знаходзяцца ў Эстрэмадуры. Рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала ўчора сканцэнтраванні мяцежнікаў у Пеньяроя, Пуэбло Нуэво і Фуэнтэ Овехуна.

* * *

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 красавіка. (БЕЛТА). На фронце Кардовы рэспубліканцы занялі Вільяарту. Мяцежнікі страцілі 600 чалавек забітымі. Захвачана 5 батарэй палявой артылерыі, 160 кулямётаў, 7 італьянскіх грузавікоў з грузам боепрыпасаў, два італьянскія танкі. Са стратай Вільяарты ў мяцежнікаў астаецца толькі адна дарога для адступлення, а іменна ў напрамку на Фуэнтэ Овехуна. Гэта дарога знаходзіцца пад агнём урадавай артылерыі.

ЗАЯВА ПАСЛА ЗША Ў МАСКВЕ ДЭВІСА

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 6 красавіка. (БЕЛТА). Сюды прыбыў пасол ЗША ў Маскве Дэвіс. У гутарцы з прадстаўнікамі друку Дэвіс заявіў: «У Совецкім Саюзе правозіцца бліскучы стымулюючы эксперымент. Гэта — велізарная лабараторыя, у якой робіцца адзін з найвялікшых эксперыментаў у галіне дзяржаўнага кіравання. Совецкі Саюз робіць дзівосныя рэчы. Кіраўнікі ўрада — гэта надзвычай здольная, сур'ёзная, напружана працуючая, моцная група мужчын і жанчын».

Дэвіс з вялікай пахвалай адзываўся аб шпаркім развіцці прамысловасці і тэхнікі ў Совецкім Саюзе і адзначыў, што насельніцтва Совецкага Саюза добра апранута і добра харчуецца.

Паводле слоў Дэвіса, усе замежныя дыпламаты ў Маскве перакананы, што Совецкі Саюз — рашучы прыхільнік міру і не жадае вайны. Дэвіс заявіў далей, што ён прадставіць даклад дзяржаўнаму дэпартаменту, затым займецца некаторымі справамі і вернецца ў Маскву 1 чэрвеня.

ПЕРАДВЫБАРЧАЯ БАРАЦЬБА Ў ЯПОНІІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 8 красавіка. (БЕЛТА). Усе газеты паведамляюць аб першай буйнай сутычцы паміж партыямі і ўрадам у сувязі з выбарамі ў парламент. Канфлікт узнік з-за прамовы генеральнага сакратара партыі Сейюкай (буржуазнай партыі парламента) Андо на перадвыбарчым мітынгу.

У Токіо, калі Андо сказаў, што «палітыка ўрада звязана на нішто канстытуцыялізм і ў канчатковым выніку прывядзе да ўстанаўлення фашызма», прадстаўнік паліцыі перарваў прамову. Андо быў часова затрыман паліцыяй з прычыны яго пратэсту супроць парушэння свабоды слова.

Кіраўніцтва партыі Сейюкай заявіла пратэст міністэрству ўнутраных спраў, указаўшы ў ім, што, калі палобны выпадак мог адбыцца ў сталіцы, не цяжка прадбачыць, да якіх крайнасцей дойдуць паліцэйскія ўлады ў правінцыі. І што таму міністэрства павінна прыняць меры да забеспячэння свабоды слоў ў выбарчай кампаніі.

Зверствы італьянцаў ў Абісініі

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 8 красавіка. (БЕЛТА). Абісінская місія апублікавала заяву, у якой паведамляецца, што больш 30 тыс. мужчын, жанчын і дзяцей забіты італьянцамі толькі ў адной Алыс-Абебе пасля замаху на Граціяні (італьянскі віцэ-кароль ў Абісініі). Масавыя забойствы цягнуліся тры дні.

ПОЛЬШЧА БУДУЕ ТУРМЫ

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 9 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Іскра паведамляе, што згодна распараджэння польскага міністра юстыцыі ў Пазнанскім ваяводстве будуць пабудаваны адзе новыя турмы «для непапраўных злачынцаў»: жаночая турма ў Баянове і мужчынская — у горадзе Тржэмешна.

* * *

ВАРШАВА, 9 красавіка. (БЕЛТА). Газета «Кур'ер поранны» паведамляе аб высылцы ў канцэнтрацыйны лагер Бярэза-Картуска 5 левых дзеячоў з горада Роўна (Валынскае ваяводства).

Учора ў Варшаве паліцыя ўчыніла шматлікія вобыскі і арыштавала 11 чалавек па падазрэнню ў камуністычнай дзейнасці.

Вучні 15-й і 11-й менскіх школ Жэня і Віця Кандрашэвічы, Давід Гінзбург і Муля Ліхтэрман цікава правялі свой першы веснавы выходны дзень за вуджэннем рыбы. НА ЗДЫМКУ: пасля першай вылазкі за горад на раку вучні варочаюцца дамоў.

Фото Дубаўца (БСФ).

ПРАДСВЯТОЧНЫ ГАНДАЛЬ

Менскі горупутгандаль зацвердзіў план прадсвяточнага і святочнага гандлю ў Менску да 1 мая. З 15 красавіка ў промтаварных магазінах будзе праводзіцца гандаль на 2 гадзіны пазней чым звычайна. Таксама працягваецца гандаль на 2 гадзіны ў харчовых магазінах з 20 красавіка. У магазінах арганізуюцца спецыяльныя сталы па прыёму папярэдніх заказаў і дастаўцы прадуктаў і тавараў на дом. Прыём папярэдніх заказаў будзе праводзіцца і на прадпрыемствах. Таксама арганізуецца продаж тавараў па квітарах праз 78 разносчыкаў.

60 тыс. паларункаў з наборам розных ласункаў атрымаюць дзеці. Хлебазаводы і цукарні да свята выпякуць 140 тыс. пірожных, 200 тыс. злобных булак, 5 тон тортаў і кексаў і шмат іншых вырабаў. З 28 па 30 красавіка ўключна ўстанаўлецца круглясутачнае дзяжурства ў бакалейных магазінах №№ 9, 49, 52, 87, у хлебных магазінах №№ 134 і 143 і ў магазіне «Гастраном» № 1.

Сталовыя і рэстараны павялічваюць у гэтыя дні асартымент страў і арганізуюць прыём заказаў на арганізацыю сямейных абедаў і вячэр. Яны таксама арганізуюць продаж кулінарных паўфабрыкатаў. З 25 па 30 красавіка ў Менску будзе праведзен калгасны прадсвяточны кірмаш.

ТЭАТРЫ БССР ДА ПЕРШАГА МАЯ

Беларускія дзяржаўныя тэатры адзначаюць 1 мая новымі пастаноўкамі. БДТ-1 узмоцнена працуе над п'есай «Салавей»—Бядулі. БДТ-2 — падрыхтоўвае да 1 мая п'есу «Банкір» — Карнейчука і спецыяльны дзіцячы спектакль «Хіжына дзядзі Тома»—Бічэр Стоў. БДТ-3 рыхтуе «Мяцеж» — Фурманава. Тэатр оперы і балета здасць оперу «Тоска» — музыка Пучыні. Пастаноўшчык—рэжысер маскоўскага тэатра імя Неміровіч-Данчэнка Златагораў.

У першамайскія дні ў Менску будуць працаваць БДТ-1 і Тэатр оперы і балета. Апрача паказу новых пастановак гэтыя тэатры вылучаць канцэртныя брыгады для абслугоўвання працоўных сталіцы БССР.

НОВЫЯ КНІГІ

ДАБРАЛЮБАЎ У ВЫДАННІ ДЗЯРЖАЎНАГА ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Вышла з друку і паступіла ў продаж у выданні сектара мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі кніга:

Дабралюбаў — выбраныя творы — на рускай мове.

Кніга мае наступныя творы вядомага крытыка: «Что такое обломовщина?», «Темное царство», «Когда же придет настоящий день?», «Луч света в темном царстве».

У кнізе змешчан крытыка-біяграфічны артыкул В. Я. Кірпоціна, у якім ён адзначае, што «па ўсёй суме сваіх светапогляда, як і па сваёй тактыцы, дзейнасць Дабралюбава належала да таго струменю грамадскай мысліі ў Расіі, які ў далейшым сваім развіцці аб'ектыўна падрыхтоўваў таржаство марксізма».

Кнігу завяршаюць артыкулы В. В. Вароўскага «Н. А. Дабралюбаў», які быў у свой час надрукаван у большэвіцкім грамадска-літаратурным журнале-штомесячніку «Просвещение», і каментарыі.

Кніга мае 358 старонак.

Тыраж 20.185 экз., цана з пераплётам 3 руб. 50 кап.

У БУДЫНКУ ЦАРСКАЙ СТАЎКІ—ДОМ ПІОНЕРАЎ

У прыгожым будынку былой царскай стаўкі (Магілеў) абсталёўваецца Дом піонераў. У Доме будзе вялікая кінозала, прыгожыя чытальні, пакоі для заняткаў розных гурткоў і адпачынку. Усе пакоі цікава афармляюцца. З Кіева атрыманы скульптуры піонера і піонеркі, якія ўпрыгожаць уваход у Дом. На абсталяванне Дома затрачваецца каля 280 тыс. рублёў. Адчыненне яго адбудзецца 1 мая.

(«Комунар Магілеўшчыны»).

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПА ПЫТАННЯХ АГРАТЭХНІКІ

Для ўкаранення дасягнення навукі ў практыку сацыялістычнага земляробства і аказання канкрэтнай дапамогі калгасам і саўгасам у справе падняцця ўраджайнасці пры Акадэміі навук БССР існуе кансультацыйнае бюро.

Кансультацыйнае бюро дае пісьмовыя і асабістыя кансультацыі па ўсіх пытаннях агратэхнікі. Для пасеўнага перыяда Акадэмія навук у 1937 г. выпускае наступныя папулярныя брашуры:

1. Эфектыўнасць торфа-фекальных кампостаў і галоўнейшых адкідаў прамысловасці на ўраджай сельскагаспадарчых культур — Власенка, Шпілеўскі, Купрэева, Гаўрылепка.
2. Як стаханаўцы-калгаснікі Чавускага раёна атрымалі тону ільновалакна з гектара — В. Чацвярыкоў і А. Геўрасеў.
3. Угнаенне пад канюшыну — І. Власенка.
4. Агратэхніка высокіх ураджаяў на глебах БССР — брыгада пад рэдакцыяй акад. Афанасьева.
5. Агратэхніка высокіх ураджаяў бульбы (вопыт барацьбы калгаснікаў Барысаўскага раёна за 3.000 пудоў з гектара). Пад рэдакцыяй праф. Н. А. Дарожкіна. (Выпускаецца па беларускай і рускай мовах).
6. Як павялічыць ураджай бульбы. Праф. Н. А. Дарожкін. II выд.
7. Як атрымаць 15 цэнтнераў ільновалакна 26 нумара з гектара — Паваротная і інш.
8. Шкоднікі гарчыцы і спосабы барацьбы з імі — Марозаў.

Акад. АФАНАСЬЕЎ.
Старшыня кансультац. бюро.

АДРАС БЮРО:
Менск, Пушкінская, 60.
Інстытут аграглебазнаўства,
Акадэмія навук БССР.

ЗМЯТАРЫ ЛЁГКАЙ НАЖЫВЫ

Загадчык менскай базы Саюзпаперабыта І. З. Арко сумесна з работнікамі гэтай базы І. Л. Іткіным і М. Г. Шапіра пры ўдзеле свайго брата М. З. Арко і студэнта мединстытута Н. М. Альпяровіча арганізаваў сістэматычнае раскрадзенне паперы розных асартыментаў з базы. Украдзеную паперу група злачынцаў збывала ў вялікай колькасці раённым друкарням (касцюковіцкай, клімавіцкай, чэрыкаўскай), а таксама магазінам розных гандлёвых арганізацый г. Менска. Так, загадчык касцюковіцкай друкарні Песачынскі купіў у іх украдзеную паперу на суму 69.293 руб. Усяго імі прадана гэтым друкарням пакрадзенай паперы на суму 82.000 рублёў.

Гэтым раскрадвальнікі не задаволіліся. Яны шукалі большага размаху для сваіх злачынстваў, у чым ім прышлі на дапамогу магазіны сістэмы Менхарчгандля. І. З. Арко дагаварваецца з сваім братам—работнікам базы Менгархарчгандля, які і збывае пакрадзеную паперу ў магазіны пад выглядам продажу яе прыватным асобам з выдуманымі прозвішчамі.

Характэрна адзначыць, што ўсе гэтыя загадчыкі магазінаў, ведаючы М. З. Арко, як работніка базы Менгархарчгандля, куплялі ў яго пакрадзеную паперу.

Крымінальным вышукам БССР па гэтай справе арыштавана і прыцягваецца да судовай адказнасці 14 чалавек.

І. МІН.

Ад Сталінскага РК КП(б)Б

Сталінскі РК КП(б)Б просіць з'явіцца ў учотны аддзел райкома наступных камуністаў: Млодзіяна, Таранава, Капельсон, Тоўсцікава. З'явіцца 9—10 красавіка да 2 гадзін дня.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 11 КРАСАВІКА:

8-30 — «Апошнія паведамленні». 12-15 — аграгутарка. 13-30 — перадача на польскай мове. 14-20 — канцэрт па заяўках калгаснікаў. 16-00 — канцэрт. 17-00 — перадача для дзяцей. 17-35 — «Апошнія паведамленні». 18-30 — — партвучоба. 20-15 — мантаж оперы Аранскага «Бахчысарайскі фантан». 21-00—камедыя «Часціца» — Марка Твэна. 22-00 — эстрада і танцы. 23-00 — «Апошнія паведамленні». 23-15 — «Апошнія паведамленні» на польскай мове.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

прызначаны на 11 красавіка,

пераносіцца на 13 красавіка

у 7 гадзін вечара ў тым-жа памяшканні (клуб імя Сталіна) з тым-жа парадкам дня.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

11 КРАСАВІКА ў 8 гадзін вечара

ў памяшканні горсовета (вул. Карла Маркса, 16, пакой № 32)

адбудзецца НАРАДА

СТАРШЫНЬ І ЗАГАДЧЫКАЎ ДАМАМІ ЖАКТАЎ І ЖБКТ, ЗАГАДЧЫКАЎ ДАМАМІ ЖЫЛТРЭСТА І СТАРШЫНЬ ДАМКОМАЎ

ПА ПЫТАННЮ ПАДРЫХТОЎКІ ДА 1 МАЯ

ЯЎКА АБАВЯЗКОВА. ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

АБ'ЯВА

АБ РЭГІСТРАЦЫІ І ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ ШТАТАЎ

Народны камісарыят фінансаў БССР і Менскі гарадскі фінансавы аддзел

НАПАМІНАЮЦЬ,

ШТО Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ПАСТАНОВАМІ СНК СССР ад 13 мая 1935 года і СНК БССР ад 8 жніўня 1935 года і інструкцыяй НКФ СССР ад 20 чэрвеня 1935 года № 550

УСТАНОВЫ, ПРАДПРЫЕМСТВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ г. МЕНСКА АБАВЯЗАНЫ ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ СВАЕ ШТАТЫ, ФОНДЫ ЗАРПЛАТЫ І КАШТАРЫСЫ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КІРАЎНІЧЫХ ВЫДАТКАЎ.

Установы, прадпрыемствы і арганізацыі, якія зарэгістравалі штаты, фонды зарплаты і каштарысы адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у 1935 і 1936 гг. пры наяўнасці змен, зацверджаных вышэйстаячай арганізацыяй у фондах зарплаты, штатах і каштарысах адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў або пры змене хоць-бы аднаго з гэтых элементаў, абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня ўнясення гэтых змен, перарэгістраваць штаты, фонды зарплаты і каштарысы адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў.

РЭГІСТРАЦЫЯ І ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ ПРАВОДЗЯЦЦА ДЛЯ НАРКАМАТАЎ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ У НКФ БССР ШТОДЗЕННА З 10 ДА 15 ГАДЗІН, А ДЛЯ АСТАТНІХ УСТАНОЎ, ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ — У МЕНСКІМ ГОРФІНАДДЗЕЛЕ ПА НЯЧОТНЫХ ЧЫСЛАХ З 10 ДА 15 ГАДЗІН.

КАРКАМФІН БССР.
МЕНГАРФА.

У ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА
Абанемент № 79

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗОРЫ ПАРЫЖА
Пачатак сеансаў 5, 7, 9 і 11 гадзін веч.

Памяшк. Дзяржаўрэйск. тэатра
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
РЫГАЛЕТО
Абанемент № 14

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ВЯЛІКІЯ КРЫЛЛІ

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ВАРОЖЫЯ СЦЕЖКІ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
РАДЗІМА КЛІЧА

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ШЧАСЛІВАЯ ЗМЕНА

НАРКАМХАРЧПРОМ БССР

Трэст „БЕЛКМО"

(Менск, Рэволюцыйная, 3)

ЯДНАЕ кандзіцерскія фабрыкі:
«КОМУНАРКА» «СПАРТАК» «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК» «Х КАСТРЫЧНІК» «ЧЫРВОНЫ МАЗЫРАНІН»

ВЫРАБЛЯЮЦЬ шырокі асартымент

КАНДЫТАРСКІХ ВЫРАБАЎ:

Карамель завёрнутую: ракавыя шыйкі, аерыносавая, аранж, „Восточная" і інш.

Шакаладныя цукеркі: „Мішка", „Беларуская картошка", „Какао-шуа", лікёр у шакаладзе, грыльяж у шакаладзе і інш.

Мантанс'е: ледзянцовае, дражэрованае, месінскае, кітайская сумесь.

Пасцілу, бананы і зефір

Мяккія цукеркі: „Крэм-Бруле", „Спорт", „Луч", „Мечта" і інш.

Павідла, варэнне джэм, халву.

Мармалад вышэйшага гатунку: яблычны, народны, жэлейны.

Пячэнне „Комунарка", „Злавчанка", „Народнае", „Новость".

ПАТРАБУЙЦЕ Ў ФІРМЕНЫХ МАГАЗІНАХ ТРЭСТА У МЕНСКУ, ГОМЕЛІ, БАБРУЙСКУ І ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ ГАСТРАНОМА, ХАРЧГАНДЛЯ і інш.

УВАГА! УВАГА!

У магазіне СТАНКАІНСТРУМЕНТ

(Менск, Пляц волі, 1/25, тэл. 22-304)

ЁСЦЬ у ПРОДАЖЫ

ПА МАНТАЖНАМУ АДДЗЕЛУ:

СТАНКІ ПРАДОЛЬНА-СТРУГАЛЬНЫЯ, ТЫПУ 712 «В», З ЭЛЕКТРААБСТАЛЯВАННЕМ, РАЗМЕРАМ 600×2000; ТАКАРНЫЯ СТАНКІ ПА ДРЭВУ; ПАДЗЯЛЯЛЬНЫЯ УНІВЕРСАЛЬНЫЯ ГАЛОЎКІ ДА ФРЭЗЕРНАГА СТАНКА; ВЕНТЫЛЯТАРЫ «СІРОКА» № 4; ЦІСКІ ПАРАЛЕЛЬНЫЯ, СТУЛАВЫЯ І РУЧНЫЯ; ТРАШЧОТКІ; ГАЕЧНЫЯ І ВЕЛАКЛЮЧЫ ЎСІХ РАЗМЕРАЎ; ВАГІ СОЦЕННЫЯ, ПАЎТОННЫЯ «ФАЛЬКО», НАСТОЛЬНЫЯ 5—20 кг. І РУЧНЫЯ БЯЗМЕНЫ 10 кг.; МАСЛЁНКІ «ШТАУФЕРА»; КАНДЭНСАЦЫЙНЫЯ ГАРШКІ; ПАЯЛЬНЫЯ ЛЯМПЫ І РОЗНЫ СТАЛЯРНЫ ІНСТРУМЕНТ.



По вымяральному аддзелу:

МІНІМЕТРЫ СА СТОЙКАМІ; ІНДЫКАТАРЫ; ПЛІТЫ ПАВЕРАЧНЫЯ; ЛІНЕЙКІ МАШТАБНЫЯ; МІКРОМЕТРЫ; ПАТРОНЫ СВЯРЛІЛЬНЫЯ ДА 25 мм.

По тэхніцы бяспецы:

ПЫЛАСОСЫ; ПЕРАНОСНЫЯ ЛЯМПЫ; РЭМНЕАДЗЯВАЦЕЛІ; ПІЦЦАВЫЯ КАЛОНКІ і інш.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКІ ФІЛІЯЛ УСЕСАЮЗНЫХ ЗАЎОЧНЫХ УЧОТНЫХ КУРСАЎ НАРКАМЗЕМА СССР (ВЗУК)

АВВЯШЧАЕ, ШТО ІМ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ заочнікаў на КУРСЫ рахункаводаў калгасаў і інструктароў-бухгалтароў

НА КАЛГАСНАМУ ЎЧОТУ РАЙЗА І МТС

для павышэння іх кваліфікацыі без адрыву ад вытворчасці.

На курсы таксама прымаюцца ўсе грамадзяне, якія жадаюць заочна дасканала вывучыць калгаснае рахункаводства па падвойнай сістэме.

Прыём і залічэнне на курсы праводзіцца бесперапынна на працягу ўсяго 1937 г.

Тэрмін навучання на курсах 8 месяцаў.

Вучэбная плата за ўвесь курс — на аддзяленні рахункаводаў — 30 руб. і аддзяленні інструктароў-бухгалтароў — 40 руб. — уносіцца адразу поўнасцю за кошт камандыруючай арганізацыі.

За падрабязнымі даведкамі звяртацца ў раённыя земельныя аддзелы або ў МТС, а таксама ў бюро гэтага філіяла ВЗУК па адрасу: Менск, Дом урада, Наркамзем, пакой № 139.

ДЫРЭКЦЫЯ ФІЛІЯЛА ВЗУК.

Уп. Галоўліт. № К—2058. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Савецкая, 63. К. К. С.